WWW.ZVIAZDA.BY — на 12 гадзін раней

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

23 ЛЮТАГА 2012 г.
ЧАЦВЕР
№ 36
(27151)

Кошт 800 рублёў

ВЫДАЕЦЦА З 9 ЖНІЎНЯ 1917 г.

Дарагія суайчыннікі!

Паважаныя воіны і ветэраны Узброеных Сіл!

Ад усёй душы віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь.

У нашай краіне няма больш свяшчэннага абавязку, чым абарона Радзімы. Неўміручую славу ў гады Вялікай Айчыннай вайны здабылі воіны-вызваліцелі. Сваім гераізмам, мужнасцю, патрыятызмам, гатоўнасцю да самаахвяравання ў імя міру, свабоды і шчасця людзей яны ўпісалі залатыя старонкі ў гісторыю Бацькаўшчыны.

Верныя традыцыям старэйшых пакаленняў нашчадкі пераможцаў сёння надзейна ахоўваюць родныя рубяжы, гарантуючы беларускаму народу права на будучыню ў адпаведнасці з яго гістарычным выбарам.

Адданасць інтарэсам краіны, высокія маральна-дзелавыя якасці і прафесіяналізм воінаў Узброеных Сіл пацвярджаюць іх гатоўнасць бездакорна служыць Айчыне.

Дзяржава заўсёды падтрымлівала і будзе падтрымліваць сваіх абаронцаў, якія забяспечваюць мір і спакой у нашым агульным доме.

Зычу вам моцнага здароўя, аптымізму, поспехаў у ратнай працы на карысць беларускага народа.

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр ЛУКАШЭНКА.

АЛЯКСАНДР ЛУКАШЭНКА ПРЫСВОІЎ ГЕНЕРАЛЬСКІЯ ЗВАННІ

Кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка 21 лютага падпісаў указы аб прысваенні воінскіх і спецыяльных званняў.

Чарговае воінскае званне генерал-маёра прысвоена палкоўнікам Ігару Бусько, Ігару Голубу, Леаніду Дзядкову, Уладзіміру Калачу і Віктару Лісоўскаму.

Палкоўніку міліцыі Валянціну Міхневічу прысвоена чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра міліцыі.

Палкоўніку ўнутранай службы Аляксандру Шамко прысвоена чарговае спецыяльнае званне генерал-маёра ўнутранай службы.

ДЗЯРЖАЎНЫХ УЗНАГАРОД І ПАДЗЯКІ ПРЭЗІДЭНТА ЎДАСТОЕНЫ РАБОТНІКІ РОЗНЫХ СФЕР

Адпаведны ўказ і распараджэнне 22 лютага падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка.

Дацэнт кафедры мытнай справы ўстановы адукацыі «Дзяржаўны інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў мытных органаў Рэспублікі Беларусь» Дзяржаўнага мытнага камітэта Таццяна Гайчук узнагароджана медалём «За працоўныя заслугі». Гэтай узнагароды яна ўдастоена за шматгадовую плённую працу ў мытных органах, значны асабісты ўклад у падрыхтоўку высокакваліфікаваных спецыялістаў.

За дасягненне высокіх спартыўных вынікаў на міжнародных спаборніцтвах спартсменам-інструктарам нацыянальнай каманды Беларусі па вольнай барацьбе Васілісе Марзалюк і Аляксею Шамараву прысвоена ганаровае званне «Заслужаны майстар спорту Рэспублікі Беларусь».

Падзяка Прэзідэнта за высокае прафесійнае майстэрства, значны ўклад у развіццё нацыянальнай культуры аб'яўлена калектыву работнікаў дзяржаўнай установы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь «Нацыянальны акадэмічны аркестр сімфанічнай і эстраднай музыкі Рэспублікі Беларусь».

За шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм і ўзорнае выкананне працоўных абавязкаў Падзяка Прэзідэнта аб'яўлена пяцярым работнікам адкрытага акцыянернага таварыства «Амкадор».

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

ЗА АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ — СВЯТОЧНЫЯ «СТО ГРАМ»... ГАРАЧАГА ЧАЮ

Курсанты Інстытута памежнай службы Беларусі з гарачым чаем і добрым настроем сустракаюць Дзень абаронцаў Айчыны.

Фота Анатоля КЛЕЩУКА.

У БЕЛАРУСІ ЗМЯНЯЕЦЦА ПАРАДАК ПРЫСВАЕННЯ КЛАСАЎ УПЕРШЫНЮ ПАСТУПАЮЧЫМ НА ДЗЯРЖСЛУЖБУ

У Беларусі змяняецца парадак прысваення класаў дзяржаўных служачых грамадзянам, якія ўпершыню паступаюць на дзяржслужбу. Адпаведны ўказ № 94 «Аб прысваенні класаў дзяржаўных служачых» Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка падпісаў 22 лютага.

«Дакумент прадугледжвае змяненне парадку прысваення класаў дзяржаўных служачых грамадзянам, якія ўпершыню паступаюць на дзяржслужбу. У адпаведнасці з указам клас дзяржаўнага служачага прысвойваецца ім не пазней як за адзін месяц з дня назначэння на пасаду», — праінфармавалі ў прэс-службе.

Гэта мера дасць магчымасць павысіць узровень заработнай платы і, адпаведна, узровень сацыяльнай абароненасці дзяржслужачых, зрабіўшы тым самым дзяржаўную службу больш прывабнай як для маладых ініцыятыўных спецыялістаў, так і для работнікаў, якія маюць вялікі вопыт практычнай работы ў арганізацыях.

У выпадку ўстанаўлення для грамадзяніна, які ўпершыню паступае на дзяржслужбу, папярэдняга выпрабавання (па пагадненні бакоў на тэрмін ад трох да шасці месяцаў у адпаведнасці з артыкулам 29 закона «Аб дзяржаўнай службе ў Рэспубліцы Беларусь») клас дзяржаўнага служачага прысвойваецца не пазней як за адзін месяц з дня заканчэння тэрміну такога выпрабавання.

Прэс-служба Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

РОЗГАЛАС

АПОШНЯЯ ІНФАРМАЦЫЯ СУТАК

МІСІЯ МВФ ПАЧАЛА РАБОТУ Ў БЕЛАРУСІ

Аглядная місія Міжнароднага валютнага фонду (МВФ) будзе працаваць у Мінску з 22 лютага па 6 сакавіка, паведамілі БЕЛТА ў Прадстаўніцтве МВФ у Беларусі.

Традыцыйная штогадовая місія будзе працаваць у рамках чацвёртага артыкула статута МВФ. «Будзе разгледжана эканамічная палітыка Беларусі за папярэдні год, а таксама змяненне эканамічнай сітуацыі ў краіне. Акрамя таго, з прадстаўнікамі ўлады будуць абмяркоўвацца пытанні эканамічнай палітыкі на бягучы год», — адзначылі ў Прадстаўніцтве МВФ. Узначаліць місію Крыс Джарвіс.

Такія кансультацыі Міжнародны валютны фонд праводзіць з усімі краінамі-членамі. У час работы місіі ў Беларусі запланаваны сустрэчы ў Міністэрстве фінансаў, на якіх бакі абмяркуюць вынікі работы фінансавай сістэмы ў 2011 годзе, а таксама асноўныя прыярытэты і задачы бюджэтна-падатковай палітыкі ў 2012 годзе.

АДНАВЯСКОВЕЦ ВЫРАТАВАЎ 4-ГАДОВАГА ХЛОПЧЫКА

У выніку пажару ў двухкватэрным доме ў вёсцы Мехавое Гарадоцкага раёна пацярпеў чатырохгадовы хлопчык.

Паводле інфармацыі Віцебскага абласнога ўпраўлення па надзвычайных сітуацыях, пажар адбыўся днём. У адной з кватэр дома жыве ўдава з дваімі дзецьмі. Жанчына працуе на ферме даяркай, і малодшага 4-гадовага сына яна звычайна брала з сабой. Старэйшая 8-гадовая дачка ходзіць у школу. Але ў гэты дзень хлопчык прыхварэў, і жанчына вырашыла пакінуць яго дома. Пажар убачыла суседка па доме. Аднавяскоўцы ўзламалі ўваходныя дзверы і разбілі акно. Але толькі 23 гадовы Яўген, слесар Гарадоцкага прадпрыемства кацельных і цеплавых сетак, не пабаяўся зайсці ўнутр і на падлозе ля дзвярэй убачыў хлопчыка ў непрытомным стане.

Да прыбыцця машыны хуткай дапамогі хлопчык знаходзіўся ў доме Яўгена, дзе маці выратавальніка-добраахвотніка рабіла дзіцяці штучнае дыханне і масаж сэрца. Хлопчыка спачатку даставілі ў Гарадоцкую раённую бальніцу, але праз тры гадзіны накіравалі ў Віцебскую абласную — у рэанімацыйнае аддзяленне. Цяпер ён знаходзіцца ў цяжкім стане, бо моцна атруціўся чадным газам.

Па папярэдніх звестках прычынай пажару з'явілася дзіцячае свавольства з агнём. Кватэру, дзе пражываюць маці з дзецьмі, раней наведвалі работнікі адукацыі, пажарнікі, участковы інспектар, аглядная камісія. І ніколі з іх боку не было якіх-небудзь прэтэнзій да гаспадыні. Паколькі ў выніку пажару кватэрай больш карыстацца нельга, сям'я перабралася да бабулі, якая жыве ў гэтай жа вёсцы.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ДОМ АДНОВЯЦЬ У МАКСІМАЛЬНА КАРОТКІ ТЭРМІН

Дом у вёсцы Малінаўка Лагойскага раёна, які быў часткова разбураны ў выніку выбуху бытавога газу, будзе адноўлены.

Пра гэта паведаміў намеснік старшыні Мінскага аблвыканкама Анатоль Мірчук, дадаўшы, што аднаўленне плануецца правесці ў максімальна кароткі тэрмін. На месцы, у Малінаўцы, ужо тыдзень працуюць праекціроўшчыкі інстытута «Белкомплекспраект». Вызначана, што паўтара пад'езда, якія знаходзяцца побач з разбураным, не пацярпелі. Нагадаем, што пакуль жыльцы гэтага дома расселеныя, пацярпелым аказана першая матэрыяльная падтрымка. Адзін чалавек загінуў у выніку выбуху, тры знаходзяцца на лячэнні, адзін з іх у цяжкім стане, другі — у стане сярэдняй цяжкасці, стан трэцяга стабільны. А следчая група працягвае сваю работу па факце надзвычайнай сітуацыі.

Марына ХІДДЖАЗ.

ЯК ПРАКЛАСЦІ АДУКАЦЫЙНЫ МАРШРУТ?

З 23 па 25 лютага ў Мінскім Палацы дзяцей і моладзі пройдзе юбілейная выстава «Адукацыя і кар'ера». За 10 гадоў свайго існавання выстава заваявала рэпутацыю важнейшай падзеі для тых людзей, якія шукаюць сваю адукацыйную траекторыю, паколькі дапамагае зарыентавацца ў моры адукацыйных паслуг, вызначыцца з выбарам прафесіі і навучальнай ўстановы, падабраць для сябе студэнцкую праграму абмену ці курсы па вывучэнні замежных моў.

У выставе возьмуць удзел адукацыйныя ўстановы больш як 10 краін свету, у тым ліку Талінскі тэхналагічны ўніверсітэт, Вільнюскі тэхнічны ўніверсітэт, Каўнаскі тэхналагічны ўніверсітэт, Кіпрскі міжнародны ўніверсітэт, Кракаўскі эканамічны ўніверсітэт, Усходне-Міжземнаморскі ўніверсітэт (Турцыя) і іншыя. Пасольства Францыі ў Рэспубліцы Беларусь падрыхтавала спецыяльную прэзентацыю «Вышэйшая адукацыя ў Францыі для беларусаў». Маштабным блокам будуць прадстаўлены на выставе расійскія ВНУ. 23 і 24 лютага выстава будзе працаваць з 10 да 18 гадзін, а 25 лютага — з 10 да 15 гадзін.

Надзея НІКАЛАЕВА.

Навіны Беларусі і замежжа ў рэжыме on-line на сайце «Звязды» — www.zviazda.by

МІХАІЛ МЯСНІКОВІЧ ЗАПРАСІЎ БІЗНЭСМЕНАЎ ААЭ ЎДЗЕЛЬНІЧАЦЬ У ПРЫВАТЫЗАЦЫІ Ў БЕЛАРУСІ

Перспектывы гандлёва-эканамічнага супрацоўніцтва паміж краінамі абмяркоўваліся ў час сустрэчы Міхаіла Мясніковіча з прэм'ер-міністрам, віцэ-прэзідэнтам, міністрам абароны Аб'яднаных Арабскіх Эміратаў, правіцелем эмірата Дубай шэйхам Мухамедам бен Рашэдам аль-Мактумам, якая прайшла 21 лютага ў дварцы правіцеля эмірата Дубай «Заабіль».

У ходзе сустрэчы шэйху Мухамеду бен Рашэду аль-Мактуму перададзена прывітанне Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі. «Адноўлена запрашэнне кіраўніка дзяржавы наведаць Беларусь з афіцыйным або прыватным візітам, — адзначылі ва ўрадзе. — Шэйх Мухамед з падзякай прыняў запрашэнне і пацвердзіў зацікаўленасць у наведванні Беларусі».

Асобна абмеркавана тэматыка прыватызацыйных працэсаў, да ўдзелу ў якіх былі запрошаны бізнэсмены ААЭ. Гэта ідэя знайшла падтрымку, і шэйхам дадзены даручэнні сфарміраваць групу экспертаў і прапрацаваць магчымыя напрамкі супрацоўніцтва з Беларуссю.

Істотны інтарэс эмірацкі бок праявіў да ўзаемадзеяння з беларускім бокам у навукова-тэхнічнай галіне. На разгляд эмірацкага боку, у прыватнасці, унесена прапанова аб стварэнні сумесных навукова-адукацыйных цэнтраў на тэрыторыі Беларусі і ААЭ для падрыхтоўкі навуковых распрацовак і іх наступнай камерцыялізацыі.

Бакі пацвердзілі актуальнасць і перспектыўнасць паступальнага ўмацавання ваенна-тэхнічнага супрацоўніцтва паміж Беларуссю і ААЭ. Па выніках сустрэчы дасягнута дамоўленасць аб наведванні Беларусі ў бліжэйшы час групай эмірацкіх экспертаў па профільных напрамках.

БЕЛТА.

БЕЛАРУСЬ І КІТАЙ МАЮЦЬ НАМЕР ПАГЛЫБЛЯЦЬ СТРАТЭГІЧНАЕ ПАРТНЁРСТВА

Кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Беларусі Уладзімір Макей 22 лютага па ініцыятыве кітайскага боку сустрэўся з Надзвычайным і Паўнамоцным Паслом Кітайскай Народнай Рэспублікі ў Беларусі Гун Цзяньвэем. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў Адміністрацыі Прэзідэнта.

Бакі адзначылі пазітыўную дынаміку развіцця беларуска-кітайскага палітычнага дыялога, фундаментам якога з'яўляюцца даверныя і дружалюбныя адносіны паміж кіраўнікамі дзяржаў. Быў падрабязна абмеркаваны графік перспектыўнага абмену візітамі на вышэйшым і высокім узроўнях з мэтай далейшага паглыблення адносін стратэгічнага партнёрства і ажыццяўлення шэрагу значных сумесных ініцыятыў. Прадстаўнікі дзвюх краін пазітыўна ахарактарызавалі ход рэалізацыі бягучых інвестыцыйных праектаў у рамках адкрытай 16-мільярднай кітайскай крэдытнай лініі і выказалі гатоўнасць да абмеркавання новых маштабных напрамкаў двухбаковага ўзаемадзеяння.

Бакі таксама з задавальненнем адзначылі супадзенне пазіцый Беларусі і Кітая па актуальным міжнародным парадку дня і высокі ўзровень узаемнай падтрымкі па адчувальных для абедзвюх дзяржаў пытаннях.

ЗЛАБАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ. ПАДРАБЯЗНЫЯ АДКАЗЫ

Зваротная сувязь

СТАРШЫНЯ Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Уладзімір АНДРЭЙЧАНКА сустрэўся 22 лютага з працоўным калектывам ААТ «Бабруйскткрыкатаж».

У актавай зале прадпрыемства сабраліся людзі, каб паслухаць высокага госця. Гэта была жывая цікавая гутарка, без падрыхтаваных прамоў і лішніх цырымоній. Уладзімір Андрэйчанка сказаў, што кіраўніцтва краіны часта сустракаецца з жыхарамі рэгіёнаў: гэта важна для абодвух бакоў і нагадвае зверку гадзіннікаў.

— Гэта зваротная сувязь з нашымі выбаршчыкамі, — патлумачыў старшыня Палаты прадстаўнікоў. — Прэзідэнт Беларусі на апошняй сустрэчы рэкамендаваў дэпутатам праводзіць **маніторынг законапраектаў** і ўжо прынятых законаў: даведвацца, як яны працуюць, якія пра іх водгукі, ці патрэбна, можа быць, унесці нейкія карэкціроўкі, змяненні, дапаўненні.

Уладзімір Андрэйчанка расказаў, што за год беларускі парламент прымае дзве сотні законапраектаў. Сёлета дэпутаты надаюць увагу нарматыўным і заканадаўчым актам, накіраваным на развіццё эканомікі краіны. Яны, у прыватнасці, датычацца падатковай сферы, адзінай эканамічнай прасторы ў межах Мытнага саюза.

Госць пазнаёміўся з працай «Бабруйскткрыкатажа»: пабываў у цэхах, пагаварыў з работнікамі на працоўных месцах, паслухаў справаздачу дырэктара Таццяны Несцеравай. У сустрэчы на прадпрыемстве браў удзел таксама **старшыня Бабруйскага гарвыканкама Дзмітрый БОНАХАЎ.**

Трыкатажная фабрыка ў Бабруйску вырабляе адзенне для спорту і адпачынку на аснове натуральнай бавоўны. Тут працуе каля 600 работнікаў, пераважная большасць з якіх — жанчыны. Сярэдні заробак летась склаў 1,615 млн рублёў. На прадпрыемстве адбываецца мадэрнізацыя, тут экспартуюць прадукцыю і свае паслугі ў Расію, Казахстан, Германію, Італію, Манголію.

Адзін з паказчыкаў паспяхавага развіцця прадпрыемства — стаючае сальда знешнегандлёвага балансу, якое склала за 2011 год 414 тысяч долараў. Гэта значыць, што «Бабруйскткрыкатаж» больш прадае за мяжу, чым набывае там сыравіны, і гэта вельмі важна.

У Бабруйску на сустрэчы з працоўным калектывам Уладзімір Андрэйчанка імкнуўся патлумачыць людзям, чаму беларусам давялося летась перажыць **непрыемныя эканамічныя эпізоды,** звязаныя з дэвальвацыяй рубля, праблемамі на валютным і спажывецкім рынках. Гэтаму ёсць і знешнія прычыны, і ўнутраныя. Аднак, адзначыў ён, гэта не азначае, што эканамічны курс краіны быў няправільным:

— Мы захавалі рэальны сектар эканомікі, і ў нас ёсць магчымасць выправіць становішча спраў.

Уладзімір Андрэйчанка нагадаў, што стабілізацыя ўжо ёсць — пра гэта сведчаць вынікі працы за студзень. Працуюць усе прадпрыемствы, і галоўнай задачай з'яўляецца павышэнне дабрабыту людзей. На пачатку 2013 года мяркуецца выйсці на ранейшы ўзровень жыцця, але не пры дапамозе напаўнення эканомікі пустымі грашыма, а за кошт інвестыцый, росту экспарту і прадукцыйнасці працы.

Старшыня Палаты прадстаўнікоў паведаміў, што **павелічэння тарыфаў на камунальныя паслугі** да канца ацяпляльнага сезона не плануецца. Як не мяркуецца бліжэйшым часам змяняць у Беларусі мяжу **пенсійнага ўзросту.** Уладзімір Андрэйчанка запэўніў: пакуль ніякіх законапраектаў у гэтай сферы не рыхтуецца.

Яшчэ адно актуальнае пытанне — **цэнаўтварэнне**. Супрацоўнік фабрыкі запытаўся: ці будзе дзяржава рэгуляваць цэны на асноўныя прадукты харчавання? І пачуў адказ: нейкі час стрымліванне цэн будзе мець месца, але гэта не з'яўляецца галоўнай задачай дзяржавы. Яна павінна найбольш дбаць пра павелічэнне ўзроўню даходаў людзей, якія мелі б магчымасць набываць неабходныя тавары па свабодных цэнах.

— Гэта сапраўды важна, каб такія высокія чыноўнікі прыязджалі да нас, — шчыра сказала **начальнік цэха Наталля РЫЧКОВА.** — Першы раз сёння такое адбылося. Цікава, што Уладзімір Паўлавіч выказваўся сваімі словамі і цалкам даступна для людзей. Жывыя зносіны — гэта лепш за тэлевізіны.

Ілона ІВАНОВА.

г. Бабруйск.

НА ВАРЦЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ БЯСПЕКІ

З нагоды

НАПЯРЭДАДНІ Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Міністр абароны Беларусі генерал-лейтэнант Юрый ЖАДОБІН сустрэўся з прадстаўнікамі СМІ.

— На жаль, свет не становіцца спакайнейшым, — зазначыў Юрый Жадобін. — Я маю на ўвазе падзеі ў Паўночнай Афрыцы, тое, што адбываецца вакол Сірыі і Ірана, краінах ЕС. Таксама мы бачым эскалацыю і напружанасць вакол нашай дзяржавы. І гэта нягледзячы на тое, што мы ні да каго не маем тэрытарыяльных прэтэнзій, не ўмешваемся ва ўнутраныя справы нашых суседзяў, не выстаўляем ім свае ўмовы. Аднак чамусьці ўсе лічаць неабходным навучыць нас, як трэба жыць. Таму гэтыя знешнія фактары прымушаюць нас дадаткова звяртаць увагу і рабіць усё для ўмацавання абараназдольнасці дзяржавы, для забеспячэння нацыянальнай бяспекі. І 2011 год, як і ўсе папярэднія, не стаў выключэннем.

І сапраўды, пра гэта сведчыць не толькі захаванне дасягнутага раней узроўню баявой і мабілізацыйнай падрыхтаванасці Узброеных Сіл, але і выпрацоўка найбольш рацыянальных спосабаў яго падтрымання ў сучасных умовах. Таму неабходна было перапрацаваць дакументы ваеннага планавання, што і адбылося. У прыватнасці, гэта датычылася прымянення рэгіянальнай групоўкі войск Беларусі і Расіі, якая абараняе інтарэсы Саюзнай дзяржавы.

На працягу 2011 года было праведзена больш за тысячу мерапрыемстваў аператыўнай і баявой падрыхтоўкі, шэраг ваенных вучэнняў як на тэрыторыі нашай краіны, так і ў іншых дзяржавах. Было працягнута планавае навучанне мабілізацыйнага рэзерву: каля 4,5 тысячы чалавек прайшлі зборы, пэўная частка з якіх атрымала перападрыхтоўку па найбольш запатрабаваных ваенна-ўліковых спецыяльнасцях. Высветлілася, што вайсковыя часці і падраздзяленні могуць у вызначаны тэрмін прывесці сябе ў найвышэйшую ступень баявой падрыхтаванасці і здольны выконваць баявыя задачы.

Што датычыцца ваеннай тэхнікі і ўзбраення, то, як сказаў міністр абароны, ва Узброеных Сілах існуюць два напрамкі дзейнасці: па-першае, падтрыманне тэхнічна спраўнага і баяздольнага стану таго парка тэхналогій, што ўжо ёсць, а, па-другое, закупка новых відаў ваеннага ўзбраення і тэхнікі як у вытворцаў нашай краіны, так і за мяжой. Юрый Жадобін адзначыў, што яшчэ працягваецца закупка той тэхнікі, якая планавалася на 2011—2012 гады. У першую чаргу, гэта сістэмы радыёэлектроннай разведкі і барацьбы, сістэмы сувязі і навігацыі, а таксама аўтаматызаваныя сістэмы кіравання.

— Летась мы ўпершыню закупілі сучасны ўзор узбраення — першую батарэю «Тор-М2». Гэта дастаткова ўнікальны зенітна-ракетны комплекс малой далёкасці, які дазваляе адначасова абстрэльваць 16 цэляў, прычым удзел чалавека тут мінімальны. Таксама мы заключылі пагадненне з нашымі расійскімі калегамі на пастаўку другой батарэі да канца гэтага года. І ў перспектыве мы будзем мець поўнасцю абсталяваны зенітна-ракетны комплекс малой далёкасці.

Такім чынам, беларуская армія забяспечана сучаснымі ўзорамі ўзбраення і ваеннай тэхнікі. Аднак, нягледзячы на гэта, працэс яе пераўзбраення актыўна працягваецца. І радуе, што пры шматлікіх выпрабаваннях і вучэннях нідзе па віне тэхнікі не было дапушчана зрыву задач. Гэта сведчыць пра тое, што тэхніка арміі адказвае ўсім запатрабаванням часу.

Не засталося без увагі міністра і пытанне захавання боепрыпасаў, якіх у нас нямала. Аднак аказалася, што толькі пэўная частка з іх патрэбна беларускай арміі. Таму бяспечныя боепрыпасы ўтылізуюць.

Дзякуючы Галоўнакамандуючаму Узброенымі Сіламі — Прэзідэнту краіны — упершыню за ўсю гісторыю існавання не было ранейшых праблем з авіяцыйнай газай, бо падрыхтоўка лётчыкаў — адна з самых фінансава важкіх.

Было закранута і адно з самых набалелых пытанняў: сёлета змяніўся час прызыву на тэрміновую ваенную службу і на службу ў рэзерве.

— У першую чаргу, гэта было звязана з летнім наборам, які праходзіў з красавіка па ліпень: якраз у той час, калі выпускнікі школ, тэхнікумаў і каледжаў збіраюцца паступаць у ВНУ, а выпускнікі вышэйшых і сярэдне-спецыяльных устаноў у гэты час здаюць дзяржаўныя іспыты ці рыхтуюцца да абароны дыпломаў, — тлумачыць сітуацыю Юрый Жадобін. — А яны вымушаны былі хадзіць па прызыўных і медыцынскіх камісіях. Вядома, гэта бударажыла грамадства. Прэзідэнт папрасіў разабрацца ў гэтым пытанні, пасля чаго мы далажылі, што мэтазгодна вярнуцца да той практыкі, якая існавала ў СССР, калі набор у армію праводзіўся вясной і восенню. І зараз мы бачым, што выбралі правільны шлях. Дарэчы, дзякуючы гэтаму змяненню колькасць прастудных захворванняў у ваеннаслужачых знізілася амаль у два разы. І гэта звязана з тым, што людзі прыйшлі ў войска ў ліставадзе і ўжо паспелі адаптавацца да халадоў, пра што нельга было сказаць раней..

У ходзе прэс-канферэнцыі было акрэслена пытанне нацыянальнай падрыхтоўкі ваенных кадраў. Высветлілася, што яна адпавядае патрабаванням сучаснай беларускай арміі. Не засталося без увагі міністра і пытанне сацыяльнай абароны вайскоўцаў, а таксама забеспячэнне іх жыллём як службовым, так і асабістым з выкарыстаннем ільготнага крэдытавання.

Узброеныя Сілы Рэспублікі Беларусь цалкам адпавядаюць усім сучасным патрабаванням і надзейна стаяць на варце нацыянальнай бяспекі.

Вераніка КАНЮТА.

Рыхтуемся да Масленіцы

З ЧЫМ БЛІНЦЫ СМАЧНЕЙШЫЯ?

ПАКАШТАВАЦЬ бліноў на Масленіцу шмат хто ласы. Тоўстыя духмяныя на дражджах, грэцкія, якія, нібы мёд, растаюць у роце, тонкія блінцы на малацэ... Смаката! І калі бліннай разнастайнасцю можа здзівіць, лічы, кожная гаспадыня, дык мачанка — страва, якая цудоўна ідзе з блінамі, чамусьці аказваецца незаслужана забытай. Гэты традыцыйны беларускі прысмак мае шмат варыяцый. Паспрабавала прыгатаваць мачанку на ўласнай кухні, і вось што з гэтага атрымалася.

ВАРЫЯНТ ПЕРШЫ. Панскі. Мясны і тлусты

Вам спатрэбіцца:

300 гр. свіных рэбраў,
80 гр. вэнджанай каўбасы,
120 гр. несалёнага сала,
200 гр. сырой хатняй каўбасы,
2 вялікія цыбуліны,
2-3 ст. лыжкі мукі,
кмен, чорны молаты перац, духмяны перац, перац-гарошак, соль

Пачаць вырашыла з самага няпростага. Рэцэпт здаваўся складаным і «неядомым» хаця б ужо з-за таго, што столькі мяснога і тлустага адразу (сапраўды, па-панску) — проста недарэчнасць нейкая для некаторых сучасных гурманаў. Паставіла рондаль з вадой, дачакалася, пакуль закіпіць. У кіпень кінула рэбры і вэнджаную каўбасу. Сала патрабавалася нарэзаць маленькімі кавалачкамі і падсмажыць, пасля чаго дадаць у патэльню два гатункі каўбасы, нарэзаныя саломкай. Туды ж паклала цыбулю, нарэзаную кольцамі, пасмажыла яшчэ хвілін 15. Заставалася толькі пасаліць і прыправіць. Па кватэры паплыў неймаверны водар, ад якога хацелася праглынуць язык.

Далей смажаная смаката разам з варанымі рэбрамі складваецца ў керамічны гаршчок і заліваецца булёнам, які застаўся ад варкі, перамешаным з мукой. Гаршчок ставіцца ў гарачую духоўку на дзве гадзіны.

У выніку нават мае дасціпныя суседзі праз паўтары гадзіны не прамінулі пацікавіцца, чым жа гэта так пахне. Мачанка атрымалася густой і сытнай, з блінцамі спалучалася цудоўна. Не шкада ні патрачанага часу, ні грошай.

СТАР. 5

ISSN 1990 - 763X

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 23.02.2012 г. (для б/н разлікаў)			
▼ 1 долар ЗША	8 150,00	1 чэшская крона	433,08
▼ 1 еўра	10 790,00	1 польскі злоты	2 578,30
1 латвійскі лат	15 450,24	▼ 1 расійскі рубель	274,00
1 літоўскі літ	3 121,41	1 украінская грыўня	1 017,16

Курсы замежных валют для безнаяўных разлікаў Цэнтрбанк РФ	
USD	29,7692
10 UAH	37,1674
10000 BYR	36,3039
EUR	39,4114

НОРКАВЫЯ ТУСОЎКІ НАПЯРЭДАДНІ ВЫБАРАЎ

Валерый Казакоў — пра патэнцыйны выбар расіян

Да выбараў у Расіі — менш за месяц. Пакуль прэтэндэнты на самы высокі дзяржаўны пост спрабуюць пераплюнуць адзін аднаго ў крэатыўнасці промакампаній, абмяркуем з кандыдатам сацыялагічных навук, старшынёй федэральнай нацыянальна-культурнай аўтаноміі «Беларусы Расіі» Валерыем КАЗАКОВЫМ, чаго чакае ад кандыдата грамадства і якія магчымыя сцэнары далейшага развіцця беларуска-расійскіх адносін.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

— Які настрой у народа напярэдадні выбараў? Гучаць неасцярожныя ацэнкі накшталт «новай рускай рэвалюцыі»...

— Хутчэй — норкавы бунт! Тое, як людзі збіраюцца на Балотнай і іншых плошчах, больш падобна да нейкай моднай тусоўкі. Туды прыходзяць зусім не змардаваныя ўладай — прыходзяць сытыя людзі ў норкавых футрах і кажуць, што будзе рэвалюцыя. Такая звычка ў нашых сучаснікаў. Любы выплеск незадавальнення групоўкі людзей — і мы адразу пачынаем на яго чапляць ярлык рэвалюцыі. Рэвалюцыя — складаная рэч, для якой патрэбна глеба. Як паводле класікаў марксізму-ленінізму: «вярхі не могуць, нізы не хочуць». Зусім не нізы прыйшлі на Балотную. А сытыя не могуць рабіць рэвалюцыю.

— Партыя ўлады, тым не менш, пачала здаваць пазіцыі, страціла канстытуцыйную большасць у парламенце...

— Гэтага трэба было чакаць. Шмат якіх памылак нарабіла «Адзіная Расія». Яна стала зборам начальнікаў, а партыя не можа складацца выключна з кіраўнікоў. Гэты праект зараз патрабуе сур'ёзнай перазагрузкі. Калі «Адзіная Расія» зможа перазагрузіцца, адкінуць бюракратычную каросту, глухасць да спраў людзей, будзе плён.

— Як патэнцыйнай партыі «Белая Русь» не паўтарыць яе памылкі?

— Калі б той дух, які панаваў у асяроддзі фракцыі «Адзінства», удалося захаваць, гэта была б годная сацыял-дэмакратычная супольнка, на якой шмат чаго можна было б зрабіць. Тым не менш, «Адзіная Расія» — шыкоўны вопыт будаўніцтва партыі ў новых сучасных межах. Калі Беларусь крытычна ўспрыме гэты вопыт, можа атрымацца нядрэнная партыя. У рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь» ёсць усе для таго задаткі. Яно паспяхова функцыянуе, у яго ёсць пярвічныя суполкі. І калі на гэтай падставе будзе зроблена партыя, усё атрымаецца. Толькі партыя павінна быць утворана не зверху, а знізу — тады гэта будзе слушна і натуральна. Я б яшчэ параіў пры трансфармацыі ў партыю змяніць і назву. Гэта магла б быць партыя нацыянальнага адзінства, згоды. У Беларусі гэтага дамагчыся нашмат прасцей, чым у Расіі, бо ваша краіна маналітная і кампактная. Тут лягчэй будзе пачуць простага чалавека і даведацца пра яго турботы. Толькі ў такой канцэпцыі ёсць будучыня.

— Тым не менш, пасля масавых пратэстаў у Расіі магчымасць другога тура прэзідэнцкіх выбараў уяўляецца ўжо не такой прывіднай...

— Я ўпэўнены, што другога тура не будзе. Пры той палітры прэтэндэнтаў, якая зараз ёсць у Расіі, сапраўдных кандыдатаў, акрамя аднаго, і няма больш. Ну паглядзіце, два вечныя прафесійныя апазіцыянеры. Я маю на ўвазе Генадзя Зюганава і Уладзіміра Жырыноўскага. Калі б у іх быў хоць якісьці шанц трапіць у прэзідэнты, яны даўно б яго выкарысталі. Сяргей Міронаў заняў, здаецца, месца млададэмакратаў — Нямцова, Яўлінскага, але яго партыя «Справядлівая Расія» выконвае ролю хутчэй намінальную. Што датычыцца Міхаіла Прохарава — гэта брэнд Суркова, той чалавек, якога Крэмль рабіў сам. Спроба алігарха стаць прэзідэнтам — нешта новае ў Расіі. Людзі, якія самі цвіка не забілі, але зрабіліся вельмі багатымі, кінуліся на ўладу. Увогуле з пачатку 1990-х гадоў гэта будуць такія сапраўдныя выбары, дзе ёсць з каго выбіраць. На жаль, не думаю, што ў Расіі сёння ёсць нейкая апазіцыя. Тым больш сістэмная. Яна калі і існуе ў той ці іншай форме, то хіба што на нейкай нацыянальнай глебе, але нічога сістэмнага, структураванага ў гэтым няма. Як, дарэчы, не бачу сістэмнай апазіцыі і ў вашай краіне. Суцэльны броўнаўскі рух.

— На расійскіх выбарах пачынаюць выкарыстоўваць высокія тэхналогіі. Электронныя комплексы апрацоўкі выбарчых бюлетэняў прымяняліся падчас парламенцкіх выбараў. Паводле прапановы прэм'ер-міністра Уладзіміра Пуціна выбарчыя ўчасткі павінны быць абсталяваны вэб-камерамі. Ці павялічваюць тэхнічныя новаўвядзенні давер выбаршчыкаў да электаральнага працэсу?

— Шмат з таго, што было на выбарах у Думу, — яно трохі наснае. Я не кажу, што там не было фальсіфікацый, не было паліттэхналогій, дагэтуль адпрацаваных недзе яшчэ. Але думаю, што ў цэлым працэс быў транспарэнтны. А тыя навінкі, якія з'явяцца на выбарчых участках, проста будуць дадатковай гарантыяй празрыстасці. Асабіста ў мяне няма адчування, што нехта можа скрасці мой голас. Я ўпэўнены, што яго залічаць менавіта таму, за каго я прагаласаваў.

— Ці не здаецца вам, што хваля новых тэхналогій можа вынесці на паверхню новыя палітычныя фігуры, якія будуць карыстацца шырокай падтрымкай. Узяць хоць бы феномен Навальнага...

— Гэта цёмны конік, які з'явіўся з інтэрнэту. Зараз людзі вельмі шмат часу праводзяць у сеціве. Таму пачалі адводзіць яму столькі ўвагі. Інтэрнэт як бог. Да яго можна звярнуцца і атрымаць адказ на любую тэму, якая цябе ў гэты час клапоціць. Толькі ці добры, ці праўдзівы гэты адказ...

— Якога адказу чакае ад кандыдата просты чалавек?

— Адназначна не прапаную накшталт «давайце гэтых выдалім і паставім новых» ці «ў гэтых усё адбяром і падзелім па-новаму». Мне думаецца, што Уладзімір Пуцін таксама будзе новым кандыдатам. Надышоў час рабіць не тое, што рабілі на працягу апошніх 10 гадоў. Гэта ўсе разумеюць. Не ўсё ідзе так, як хацелася б уладзе, улада гэта чуе. І мы гэта адчуваем па тых артыкулах, якія напісаў Пуцін. Калі возьмем і складзем гэту мазаіку, стане зразумела, што там ахоплены ўвесь спектр сацыяльных пытанняў, якія стаяць перад дзяржавай. У сучаснай Расіі няма больш узораў, каб нехта браў на сябе адказнасць выказацца па нацыянальным пытанні, даць эканамічны і палітычны зрэз таго, што зараз адбываецца. Яго артыкулы сталі калі не маніфестам, то прынамсі запрашэннем да канструктыўнай размовы. Мне як сацыёлагу гэта дае надзею на тое, што ў Расіі нарэшце з'явіцца нейкая дзяржаўная ідэалогія. Гэта тыя слупы, на якіх можа трымацца новая расійская ідэалогія. Ідэалогія дэмакратычнай супольнасці, якая жыве сваім розумам, у міры і згодзе са сваімі суседзямі.

— Вырашэння якіх праблем найбольш жадае выбаршчык?

— Галоўная бяда Расіі — гэта вялікая розніца паміж багатымі і беднымі. Трэба паставіць кропку ў той стыхійнай прыватызацыі, якая адбылася, алігархі павінны зрабіць дабрачынныя ўнёскі ў скарбонку самой Расіі, каб дзяржава стала менш беднай. Супербагатыя, на маю думку, павінны сваімі супердаходамі дзяліцца з тымі людзьмі, якіх яны эксплуатуюць.

— Якія далейшыя сцэнары адносін Беларусі і Расіі можна прадугледзець?

— Наўрад ці вынікі выбараў паўплываюць на адносіны Беларусі і Расіі. Па заявах палітыкаў, уладных асоб, персон, з якімі я сустракаюся, адчуваецца: з іх боку няма нейкіх намаганняў, каб змяніць тое, што ёсць. Няма такога жадання і ў народаў дзвюх краін. Я магу зрабіць такую выснову, ведаючы стаўленне людзей у Расіі да беларусаў. Таму не думаю, што беларуска-расійскія стасункі будуць неяк кардынальна мяняцца пасля выбараў. Я не веру тым аналітыкам, якія кажуць што адносіны паміж дзвюма краінамі пагоршацца. Я лічу, што яны будуць толькі паглыбляцца. Задума Еўразійскага саюза — даўняя і не аднабаковая.

— Як пачуваюцца зараз беларусы ў Расіі?

— Беларуская дыяспара ў Расіі — гэта вялікая супольнасць, якая мае свае аддзелы ва ўсіх суб'ектах федэрацыі. Яна на дабрачынных пачатках змагаецца з той натуральнай асіміляцыяй, якая адбываецца. На жаль, з кіраўнікоў абласных беларускіх супольнасцяў добра калі 5-6 чалавек ведаюць беларускую мову на ўзроўні. Да нядаўняга часу беларусы ў Расіі амаль не займаліся праблемамі мовы. Зараз пачалі гэта рабіць, але ўсё ідзе нялёгка: як даць людзям мову, калі няма беларускамоўнага асяродку? У Маскве ёсць польскі, нямецкі, татарскі дом, а беларускага дагэтуль няма. Ён быў бы добрым падмуркам, каб развіваць беларушчыну ў Расіі. Мы павінны змагацца за беларускую мову, падтрымліваць свае традыцыі — гэта тое, на чым трымаецца наша ідэнтычнасць. У сваёй нацыянальна-культурнай аўтаноміі беларусаў Расіі мы арыентаваныя менавіта на гэта. Наш самы любімы праект — «Сіні пашпарт»: мы ладзім нацыянальныя фэсты, вечарыны, запрашаем беларускамоўныя гурты. Расія для нас, беларусаў, не плавільны кацёл, дзе ўсё ператвараецца ў адзіную масу. Яна ўяўляецца мне гэткім боскім прэсам, які хоць у пэўнай ступені і сціскае, але ўсё ж захоўвае тую самабытнасць, якая ў чалавеку ёсць. Астатняе залежыць ад нас.

Ала МАЧАЛАВА.

ПАВЫСІЦЬ ПЕНСІЮ З ДАПАМОГАЙ РЭФОРМЫ?

Эксперты лічаць, што пенсійная сістэма ў нашай краіне ў бліжэйшай будучыні будзе адчуваць цяжкасці ў сувязі з недахопам грошай для выплаты пенсій. А значыць, мы саспелі для таго, каб сур'ёзна думаць пра яе рэформу. Пра гэта ўжо гавораць і ва ўрадзе. Аднак гэтая рэформа, якая абавязкова закране інтарэсы кожнага жыхара Беларусі, павінна быць старанна прадумана.

Пры вырашэнні гэтага важнага пытання не хоча заставацца ў баку і бізнэс. Каб абмеркаваць праблемы пенсійнай сістэмы, бізнэс-саюз прадпрымальнікаў і наймальнікаў імя М.С. Куняўскага правёў «круглы стол» на тэму «Перспектывы развіцця пенсійнай сістэмы Рэспублікі Беларусь».

Нашы людзі не думаюць пра старасць

Размеркавальная пенсійная сістэма, якая дзейнічае ў краіне, заключаецца ў наступным: пенсіі сённяшнім пенсіянерам плацяцца з падаткаў пакалення, якое зараз працуе. Калі гэтае пакаленне пойдзе на пенсію, іх пенсія будзе складацца з узносаў і падаткаў будучага пакалення. Гэта значыць, тыя, хто працуюць, забяспечваюць пенсіянераў. Чым больш людзей працуюць, тым больш сродкаў ідзе ў пенсійную частку Фонду сацыяльнай абароны.

Але сітуацыя ў апошні час такая, што можна з упэўненасцю казаць: рэспубліка знаходзіцца на парозе «дэмаграфічнай ямы». Маладых людзей, якія ўступаюць у працоўнае жыццё, з кожным годам становіцца прыкметна менш. А хутка дасягаць працаздольнага ўзросту пачнуць тыя, хто нарадзіўся ў 90-я гады XX стагоддзя, калі нараджальнасць у Беларусі прыкметна знізілася.

Па звестках Мінпрацы, на сённяшні дзень на 100 чалавек у працаздольным узросце маецца 63 чалавекі ва ўзросце старэйшым за працаздольны. За 2011 год колькасць атрымальнікаў пенсій у органах па працы, занятасці і сацабароне ўзрасла на 18 тыс. чалавек і дасягнула амаль 2,5 млн чалавек. А да 2030 года дэмаграфічная нагрузка на працаздольнае насельніцтва, паводле прагнозаў, узрасце яшчэ на 30%. «Рэзкі рост колькасці насельніцтва старэйшых узростаў запатрабуе значнага павелічэння выдаткаў на пенсійнае забеспячэнне, арганізацыю спецыяльнай сацыяльнай дапамогі», — заявіла на нядаўняй калегіі **Мінпрацы міністр працы і сацыяльнай абароны Марыяна ШЧОТКІНА**. Усё гэта падштурхоўвае да рэфармавання пенсійнай сістэмы.

Ёсць і такі момант: на Захадзе людзі пачынаюць задумвацца аб сваёй пенсіі яшчэ ў маладосці. У нас жа маса маладых людзей зусім не думае аб забеспячэнні свайго жыцця ў пажылым узросце. Работнікі сярэдняга ўзросту таксама не знаходзяць матывацыі для павышэння сваёй афіцыйнай заработнай платы. Усё разам гэта прыводзіць да таго, што дастаткова шырока практыкуецца «шэры» заробак, з якога страхавыя ўзносы на пенсію не адлічваюцца. Але людзі павінны разумець, што пенсію трэба зарабіць. Напрыклад, атрымліваючы добрую зарплату ў канвертах і мізэрную афіцыйную зарплату, яны павінны ведаць, што калі выйдуць на пенсію, то пры яе налічэнні «канвертны» заробак улічвацца не будзе.

Сярод недахопаў нашай сістэмы эксперты таксама вылучаюць высокі ўзровень адлічэнняў у Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва, адсутнасць стымулаў да прадаўжэння працоўнага стажу, нізкі ўзровень пенсій, ураўнілаўку, немагчымасць кантраляваць адлічэнні на будучую пенсію.

Хоць нельга не адзначыць і плюсы дзейснай пенсійнай сістэмы: яна валодае высокай устойлівасцю да фінансавых крызісаў, дазваляе выплачваць пенсіі без затрымак і перапынкаў, пераразмяркоўвае даходы на карысць малааплатных работнікаў і забяспечвае ўсім задавальненне мінімальных жыццёвых патрэб. Але, на жаль, сённяшнія рэаліі такія, што пытанняў да яе становіцца ўсё больш і больш.

Ну, а які інтарэс у тым, каб паўдзельнічаць у рэформе, у прыватнага бізнэсу? Справа ў тым, што наша сённяшняя пенсійная сістэма лаяльная да работніка. Ён плаціць усяго 1% страхавых узносаў, а наймальнік за яго плаціць 28%. Бізнэс жа зацікаўлены ў павышэнні сваёй канкурэнтаздольнасці і паніжэнні падатковых выплат, у тым ліку і ў пытанні размеркавання пенсійнай страхавой нагрузкі паміж наймальнікамі і работнікамі. Таму ён выступае з прапановай знізіць стаўку адлічэнняў у пенсійны фонд для наймальнікаў і адначасова павысіць яе для работнікаў.

Пенсію трэба зарабіць

Калі мы гаворым аб рэформе пенсійнай сістэмы, у першую чаргу ўзнікае пытанне пенсійнага ўзросту. Яго трэба павышаць, так кажуць у апошні час многія эксперты. Але рабіць гэта прапануецца паступова. Так, адзін з іх, **кандыдат эканамічных навук Леанід ЗЛОТНІКАЎ,** прапануе зрушыць пенсійны ўзрост у жанчын на 5 гадоў наперад на працягу 2013—2022 гг., па паўгода за год; у мужчын — на 3 гады на працягу 2023—2028 гг., таксама па паўгода за год.

Незалежныя эксперты прадставілі дзве канцэпцыі рэформы пенсійнай сістэмы, якія прадугледжваюць двухузроўневую сістэму. Першы ўзровень — размеркавальная пенсія. Гэта азначае, што ўсім, хто дасягнуў пенсійнага ўзросту, будзе выплачвацца гарантаваны мінімум, які забяспечваецца дзяржавай. Другі ўзровень — накапляльная і ўмоўна-накапляльная пенсія, памер якой будзе залежаць ад сумы накапленняў самога пенсіянера.

«Трэба абапірацца на дзве нагі, гэта значыць, рабіць камбінаваную сістэму. Адзін узровень — накапляльны, другі — умоўна-накапляльны», — упэўнены Леанід Злотнікаў. Двухузроўневая сістэма, на яго думку, садзейнічае страхаванню накапленняў ад інфляцыі і фінансавых крызісаў, павышэнню матывацыі да назапашвання пенсій і падаўжэння працоўнага стажу, уключэнню работнікаў у накапленне пенсій і зніжэнню падатковай нагрузкі на прадпрымальнікаў, а таксама прыцягненню інвестыцый у эканоміку («доўгіх рублёў»).

Але адначасовы пераход да накапляльнага і ўмоўна-накапляльнага ўзроўняў патрабуе некаторых умоў: развітага рынку страхавання жыцця, існавання інвестыцыйных фондаў, наяўнасці фінансавых інструментаў, даверу насельніцтва да фінансавых устаноў. І вельмі важны момант — гарантыі ад нямэтавага выкарыстання пенсійных сродкаў. Цяпер краіна не гатова да гэтага, лічыць **кандыдат эканамічных навук Наталля ПРАКОФ'ЕВА**. Яна прапануе пераходзіць да камбінаванай сістэмы паступова.

Не сакрэт, што ў нас сёння вельмі вялікая колькасць людзей выходзіць на датэрміновую пенсію альбо плаціць страхавыя ўзносы не агульнаўстаноўленыя, а меншай велічыні (калегіі адвакатаў, фермеры, вытворцы сельскагаспадарчай прадукцыі). Таму, на думку Наталлі Пракоф'евай, на першым, падрыхтоўчым этапе варта ліквідаваць ці скараціць залішнія пенсійныя правы, якія фарміруе існуючая сістэма.

На другім этапе яна прапаноўвае ўвесці толькі адну ўмоўна-накапляльную сістэму (УНС) з устаноўленымі ўзносамі. Гэта дазволіць пазбавіцца ад праблемы фінансавання пераходнага перыяду. Разам з тым будзе забяспечана сувязь паміж узносамі і велічынёй пенсіі, стымул да выплаты ўзносаў і будзе страчаны стымул да датэрміновага выхаду на пенсію.

Але УНС не вырашыць іншых праблем. А менавіта: не створыць дадатковых зберажэнняў (доўгіх грошай), якія так неабходны для забеспячэння эканамічнага росту. І не зможа забяспечыць істотнага прыросту памеру пенсій. Разам з тым гэта, па словах Н. Пракоф'евай, неабходны этап да наступнага, больш высокага — накапляльнага ўзроўню, які патрабуе больш кваліфікаванага адміністравання. Акрамя таго, Н. Пракоф'ева лічыць мэтазгодным вылучыць пенсійны фонд з Фонду сацыяльнай абароны насельніцтва.

Саветнік Міжнароднай фінансавай карпарацыі Валерый Фадзееў прадставіў другую канцэпцыю рэформы пенсійнай сістэмы. На яго думку, пенсійная сістэма павінна складацца з двух узроўняў — абавязковыя страхавыя пенсіі і выплаты за кошт умоўна-накапляльных узносаў. Пры гэтым у некаторых выпадках крыніцай фінансавых сродкаў для выплаты пенсій павінна з'яўляцца дзяржава. Ён таксама падкрэсліў, што пенсійная сістэма павінна стымуляваць зацікаўленасць працуючых грамадзян рабіць адлічэнні на будучую пенсію ў як мага большых памерах.

Святлана БУСЬКО.

Накапляльная сістэма ў іншых краінах сябе не апраўдала

Намеснік начальніка аддзела развіцця пенсійнай сістэмы ўпраўлення пенсійнага забеспячэння і сацыяльнага страхавання Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь Соф'я СВЯРДЛОВА:

— Міністэрства бачыць тыя пытанні, якія стаяць перад пенсійнай сістэмай. Праблемы вывучаюцца і разглядаюцца, у тым ліку пільная ўвага надавалася ўмоўна-накапляльным рахункам — сістэме, якая працуе ў шэрагу еўрапейскіх краін. У яе ёсць і плюсы, і мінусы. Але галоўная задача пенсійнай сістэмы — гэта недапушчэнне беднасці ў старасці. І ў першую чаргу трэба думаць аб канкрэтных людзях, аб тых, хто на гэтую пенсію будзе жыць. Таму такая вялікая ўвага да накапляльнага элемента не зусім зразумелая. Мы бачым негатыўны вопыт краін, якія перайшлі на накапляльную сістэму, такіх як Чылі і шэраг краін Лацінскай Амерыкі. І Сусветны банк ад гэтых рэкамендацый ужо практычна адмаўляецца, бачачы наступствы такога пераходу. Паглядзіце, што сёння адбываецца з накапляльным кампанентам у Расіі. Там распачалі нешта накшталт такой рэформы. На сённяшні дзень чаканні ад накапляльнага кампанента цалкам не апраўдаліся. Мала таго, што ён прывёў да каласальнага дэфіцыту пенсійнага фонду і не вывеў з шэрых схем зарплаты — зараз, у святле апошніх крызісных гадоў і нізкай прыбытковасці, незразумела, што з ім рабіць. І цяпер Расія стаіць на парозе новай пенсійнай рэформы. Так што падыходзіць да рэфармавання сістэмы трэба вельмі ўважана.

Наша сістэма нядрэнная, але формула разліку пенсій змяшчае шмат перараэмеркавальных механізмаў.

Дырэктар НДІ працы Міністэрства працы і сацабароны, кандыдат эканамічных навук Святлана ШАЎЧЭНКА:

— З 2001 года нашаму інстытуту неаднаразова заказваліся работы, у рамках якіх выбудоўвалася канцэпцыя рэфармавання пенсійнай сістэмы. Сумесна з Мінпрацы рабочай групай ствараласяся стратэгія рэфармавання пенсійнай сістэмы, мы падзялявалі пераход да парытэтнай выплаты страхавых узносаў наймальнікаў і работнікаў, адпрацоўвалі прынцыпы пераходу на прафесійнае пенсійнае страхаванне. Існуючая сёння пенсійная сістэма ў прынцыпе нядрэнная, але формула разліку пенсійных выплат змяшчае вялікую колькасць перараэмеркавальных механізмаў. За кошт гэтага і атрымліваецца, што індывідуальныя каэфіцыенты замяшчэння пенсій мінулага заробку розныя. Але калі б у дзяржавы былі дастатковыя бюджэтныя сродкі, яна б кампенсавала розніцу паміж бюджэтам пражыткавага мінімуму і нізкай працоўнай пенсіяй, якая абумоўлена нізкім заробкам у мінулым. Сама ж па сабе наша сістэма мае ў сабе ўсе элементы, неабходныя для таго, каб пры нармальна дыферэнцаваных даходах і змене той формулы, якая сёння ёсць, пенсіянеры атрымлівалі нармальную пенсію.

МЕРКАВАННЕ

У працэсе рэформы павялічыцца колькасць інсультаў, інфарктаў, суіцыдаў

Прафесар кафедры сацыяльнай работы Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій БДУ Эдуард ЗБАРОЎСКІ:

Да рэформы пенсійнай сістэмы трэба вельмі сур'ёзна рыхтавацца. У нас у краіне высокі ўзровень смяротнасці ў працаздольным узросце. Гэтага нельга не ўлічваць. Нам трэба падумаць пра падушку бяспекі, а для гэтага абмяркоўваць не толькі эканамічныя пытанні, але і медыка-сацыяльна-псіхалагічныя аспекты.

У нас сёння 5,2% насельніцтва атрымліваюць пенсію па інваліднасці. А ў Германіі — менш за 2%. Як там гэтага дабіліся? Яны ўвялі сістэму прыярытэту рэабілітацыі перад пенсіяй. Пытанне аб пенсіі не ставіцца, пакуль не будуць прыняты ўсе намаганні па рэабілітацыі. І сёння, калі мы гаворым пра надыходзячы дэфіцыт працоўных рэсурсаў, гэта тое, з чаго трэба пачынаць. Кадры, якія будуць праводзіць рэабілітацыю, ужо ёсць. Цяпер у нас у БДУ створана сістэма падрыхтоўкі спецыялістаў па сацыяльнай рабоце, у тым ліку вылучана спецыяльнасць «сацыяльна-рэабілітацыйная дзейнасць». І сістэму рэабілітацыі трэба ўводзіць, на мой погляд, неадкладна.

ОБЪЯВЛЕНИЕ

23 марта 2012 года в актовом зале Минского завода технологических металлоконструкций по адресу: г. Минск, ул. Радиальная, 13 СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ»

Начало собрания в **14.00**.

Регистрация акционеров (по предъявлении документа, удостоверяющего личность, для представителя акционеров дополнительно – доверенность, заверенную в соответствии с законодательством) с **12.00** до **13.30**, согласно реестру акционеров по состоянию на 03.01.2012 года.

ПОВЕСТКА ДНЯ

1. Отчет Дирекции о финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основные направления деятельности Общества на 2012 год.
2. Отчет ревизионной комиссии за 2011 год. Заключение по годовым отчетам и балансу Общества.
3. Отчет Совета директоров за 2011 год.
4. Отзыв Совета директоров по годовому балансу и деятельности Дирекции.
5. Утверждение годовых отчетов и бухгалтерского баланса, прибыли Общества, распределения чистой прибыли Общества за 2011 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли на 2012 год.
7. Об утверждении дивидендов за 2011 год.
8. Утверждение условий материального вознаграждения членов Совета директоров и ревизионной комиссии.
9. Выборы членов Совета директоров.
10. Выборы членов ревизионной комиссии.
11. О наделении Совета директоров Общества полномочиями, отнесенными Уставом к компетенции общего собрания.
12. О внесении изменений в Устав ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ».

С материалами собрания можно ознакомиться в рабочие дни (понедельник–пятница) с 16 марта 2012 года в Исполнительной администрации ОАО «ПРОМТЕХМОНТАЖ» по адресу: г. Минск, пер. Калининградский, 19А.

УНП 100185330 ***Совет директоров***

ИЗВЕЩЕНИЕ

УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!

ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 марта 2012 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основные направления развития на 2012 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2011 год.
3. Об использовании чистой прибыли, полученной в 2011 году и выплате дивидендов за 2011 год.
4. Утверждение нормативов использования чистой прибыли на 2012 год.
5. О предоставлении юридическим лицам безвозмездной (спонсорской) помощи.
6. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу: **Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2.**

Начало в 14.00.

Регистрация участников собрания **с 12.00 до 13.45.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
Акционеру Общества – **паспорт**;
Представителю акционера – **паспорт и доверенность**.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2012 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 20 марта 2012 года.

УНП 400076540 **Наблюдательный совет.**

Трагедыя

ВЯДРО З ВУГОЛЛЕМ НАРАБІЛА БЯДЫ

У г.п. Лагішын (Пінскі раён) 76-гадовая гаспадыня і яе 51-гадовы сын палезлі ў склеп перабіраць бульбу.

Каб не змерзнуць і не замарозіць бульбу, пенсіянерка паставіла вядро з вуголлем. Маці з сынам загінулі ад чаднага газу, які сабраўся ў склепе. Знайшла іх там жонка сына, калі захвалявалася, што муж не вярнуўся дамоў.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь выказваюць глыбокае спачуванне намесніку старшыні Палаты прадстаўнікоў па правах чалавека, нацыянальных адносінах і сродках масавай інфармацыі, Старшыні Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі Рэспублікі Беларусь Давыдзьку Генадзю Браніслававічу ў сувязі з напаткаўшым яго вялікім горам — смерцю БАЦЬКІ.

ОАО «ХОРОШЕЕ НАСТРОЕНИЕ»

извещает акционеров о проведении 23 марта 2012 г. очередного общего собрания акционеров

Собрание состоится в 16.00 в помещении кафе «Рико» по адресу: г. Минск, ул. Центральная, 6.

Повестка дня:

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 г.
2. Отчет ревизионной комиссии о работе за 2011 г.
3. Утверждение бухгалтерского баланса и отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 г.
4. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2011 г.
5. Избрание членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Регистрация участников собрания с 15.00 до 15.45. При себе иметь паспорт. Справки по тел.: 242 66 41, 242 67 07.

УНП 100097687 **Наблюдательный совет.**

Аб'ява аб прыёме ў ад'юнктуру і дактарантуру ўстановы адукацыі «Акадэмія Міністэрства ўнутраных спраў Рэспублікі Беларусь» на 2012 год.

Па даведкі звяртацца:
Адрас: 220005, Мінск, пр. Машэрава, 6.
Тэл.: 289 21 43, 289 21 37.
Web-сайт: academy.mia.by (раздзел «Паслявузаўская адукацыя»)
Колькасць месцаў на спецыяльнасцях:
12.00.01 — тэорыя і гісторыя права і дзяржавы; гісторыя вучэнняў аб праве і дзяржаве: 1 (дзённая форма атрымання I ступені паслявузаўскай адукацыі); 1 (завочная форма атрымання I ступені паслявузаўскай адукацыі); 1 (дзённая форма атрымання II ступені паслявузаўскай адукацыі);
12.00.02 — канстытуцыйнае права; муніцыпальнае права: 1; 2, -;
12.00.03 — грамадзянскае права; прадпрымальніцкае права; сямейнае права; міжнароднае прыватнае права: 1; 2, -;
12.00.08 — крымінальнае права і крыміналогія; крымінальна-выканаўчае права: 4; 1; -;
12.00.09 — крымінальны працэс, крыміналістыка; аператыўна-вышукная дзейнасць: 9; 2; 1;
12.00.14 — адміністрацыйнае права, фінансавае права, інфармацыйнае права: 1; 1; 1;
19.00.06 — юрыдычная псіхалогія: 2; -; -.

Права на паступленне ў ад'юнктуру Акадэміі МУС даецца супрацоўнікам органаў унутраных спраў, якія не дасягнулі на момант залічэння 35 гадоў (на дзённую форму навучання), маюць дыплом аб вышэйшай адукацыі, схільнасць да навуковых даследаванняў, пацверджаную навуковымі публікацыямі, удзелам у навукова-даследчых і інавацыйных праектах, канферэнцыях ці іншымі матэрыяламі; а таксама вопыт практычнай работы не менш за тры гады на пасадах сяржанта і старшага начальніцкага складу, якія станоўча зарэкамендавалі сябе па службе.

Тыя, хто паступае ў ад'юнктуру для атрымання навуковай кваліфікацыі «Даследчык» на дзённай ці завочнай форме атрымання адукацыі, павінны здаць кандыдацкія экзамены і залікі па агульнаадукацыйных дысцыплінах да паступлення ў ад'юнктуру. *УНП 100926541*

СПРАВАЗДАЧА

Мясцовага гуманітарна-асветніцкага фонду «Жывое партнёрства» за 2011 год

Мясцовы гуманітарна-асветніцкі фонд «Жывое партнёрства» (далей – Фонд), зарэгістраваны 27.11.2003 г. рашэннем Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь №2044, змяніў статус з «Міжнароднага» на «Мясцовы» рашэннем Галоўнага Упраўлення юстыцыі Мінгарвыканкама ад 24 траўня 2011 года № 18 (Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі Фонду № 05/0053).

Юрыдычны адрас і адрас офіса Фонду: 220030, г. Мінск, вул. Энгельса, 34А, корп. 2, пак. 627.

Заснавальнікі Фонду: фізічныя асобы – грамадзяне Рэспублікі Беларусь – тры асобы; фізічная асоба – грамадзянка Федэратыўнай Рэспублікі Германія: юрыдычная асоба – фонд «Лебен нах Чарнобыль» (Франкфурт-на-Майне, ФРГ).

У справаздачны перыяд дзейнасць Фонду была арыентавана на выкананне статутных мэтаў, скіраваных на рэалізацыю прынцыпаў устойлівага развіцця дзеля захавання ўмоваў жыцця для цяперашняга і будучага пакаленняў.

Асноўныя праекты Фонду ў справаздачным годзе:
- «Стварэнне сельскага сацыяльна-дзелавога цэнтра ў в. Залессе».
- «Умацаванне грамадскага ўзаемадзення для ўстойлівага развіцця сельскіх рэгіёнаў Беларусі».

Кошт маёмасці Фонду (у тым ліку, якая была перададзена заснавальнікамі) паводле стану на 01.01.2012 – 23 856 704 бел.руб.

Рэшта фінансавых сродкаў на рахунку Фонду на 01.01.2011 – 15 894 626 бел. руб.

Даходы ад ажыццяўлення прадпрымальніцкай дзейнасці – 10 080 000 бел. руб.

Бязвыплатная (дабрачынная) дапамога грамадзян і арганізацый дзеля ажыццяўлення праграм Фонду – 173 268 357 бел. руб.

Сума выдаткаў, панесеных Фондам дзеля дасягнення грамадска-карысных мэтаў, указаных у Статуце – 142 934 945 бел. руб.

Рэшта фінансавых сродкаў на рахунку Фонду на 01.01.2012 – 97 352 343 бел. руб.

Усе выдаткі былі скіраваны на дасягненне мэтаў, адпаведных Статуту Фонду.

Выканаўчы дырэктар – Анжэла Максімава
Галоўны бухгалтар – Сяргей Раманцоў.

Вниманию акционеров УНП 200075134

ОАО «БЕЛСОЛОД»

27 марта 2012 г. по адресу: г. Иваново, ул. Полевая, 32, СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ.

Начало работы собрания **в 13.30.**

Время регистрации участников собрания — в день проведения собрания **с 12.30 до 13.30.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 г.
2. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год и основных направлениях деятельности Общества на 2012 г.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверок финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета и бухгалтерского баланса Общества, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 г. Утверждение порядка распределения чистой прибыли за 2011 год.
5. О направлениях использования чистой прибыли на 2012 год.
6. Об избрании членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
7. Об утверждении

МЕСТНОЕ САМОУПРАВЛЕНИЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

23 лютага 2012 г. № 4 (276)

СПОРТ ЧЫНОЎ НЕ ПРЫЗНАЕ

Больш як 400 чыноўнікаў Гомельшчыны змянілі на мінулыя выхадныя дні кабінеты на спортпляцоўкі. Яшчэ каля 600 прыехалі ў горад над Сожам з усіх раёнаў вобласці, каб прадэманстраваць сваё майстэрства ў самых розных жанрах мастацкай самадзейнасці. У рэгіёне прайшла 13-я спартакіяда кіруючых работнікаў.

За 13 гадоў вызначыліся прыярытэтныя віды спорту, якім аддаюць перавагу чыноўнікі ў тым ці іншым раёне. Напрыклад, у Жлобінскім усе, на чале са старшынёй Леанідам Апанасюком, гуляюць у валейбол. Дарэчы, сам кіраўнік раёна прызнаўся, што менавіта дзякуючы заняткам у спартыўнай зале скінуў 15 кг лішняй вагі.

Спаборніцтвы «белых каўнерыкаў» праходзілі і па міні-футболе, більярдзе, настольным тэнісе, стральбе з пнеўматычнага пісталета і шахматах. Упершыню ў праграму быў уключаны вялікі тэніс. Тым не менш на ўдзел падалі заяўкі адразу 18 чыноўнікаў вобласці на чале з намеснікам старшыні Гомельскага аблвыканкама Яраславам Пірштуком. Гэтым відам спорту ён захапіўся гадоў 10 таму і здрадзіць яму ўжо не можа, хоць не грэбуе і футболам, і баскетболам, і більярдам, і малым тэнісам. Баляслаў Казіміравіч растлумачыў, чаму яму падабаецца менавіта вялікі тэніс, якому аддае абавязкова 2-3 гадзіны на тыдзень:

— Каб перамагчы, трэба сканцэнтравацца, мабілізавацца. Як і ў працы, між іншым. Тэніс гарантуе добрую фізічную падрыхтоўку. Да таго ж гэта інтэлектуальны від спорту.

Прайграваць не жадае ніхто, тым больш што спартакіяда — гэта магчымасць для актыўных кіраўнікоў любога ўзроўню выявіць лідарскія якасці не толькі на сваім працоўным месцы. Дарэчы, сёлета ўдзел ў спартакіядзе і конкурсе аматарскай творчасці прынялі і старшыні Саветаў дэпутатаў усіх узроўняў. Кіраўнік абласнога Савета дэпутатаў Марына Бондар, як высветлілася, нядрэнна страляе з пісталета. На «лінію агню» яна выйшла разам са старшынёй Гомельскага аблвыканкама Уладзімірам Дворнікам. Ён дарэчы, любіць яшчэ і футбол, хакей, лёгкую атлетыку і лыжы.

— У спорце не павінна быць чыноў і пасад — тут перамагае мацнейшы. Але ж калі чалавек здольны добра працаваць, у яго паўсюль будзе атрымлівацца добра, у тым ліку і ў спартыўных спаборніцтвах.

Дарэчы, Гомельшчына — спартыўная вобласць. Летась яна стала абсалютным лідарам па колькасці выйграных залатых узнагарод на сусветных спаборніцтвах.

Пераможцаў у творчых спаборніцтвах вызначалі па 14 намінацыях. Лепшым салістам стала начальнік арганізацыйна-кадравай работы Наталля Ананіч з адміністрацыі Цэнтральнага раёна Гомеля, чытальнікам — начальнік аддзела культуры Брагінскага райвыканкама Ліна Пятніцкая. Першае месца за канцэртную праграму падзялілі Гомельскі гарвыканкам і Рэчыцкі райвыканкам. Акрамя таго, удзельнікі мерапрыемства прадставілі асабістыя калекцыі і вырабы мастацкай і тэхнічнай творчасці.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ДАРОГІ ПАД КАНТРОЛЕМ

На Віцебшчыне праводзіцца маштабнае мерапрыемства «Зімовая дарога», мэта якой — павышэнне бяспекі дарожнага руху.

На тэрыторыі Віцебскай вобласці аператыўна-прафілактычнае мерапрыемства «Зімовая дарога» праводзіцца з 20 лютага па 3 сакавіка. За гэты час будзе праверана работа дарожна-эксплуатацыйных арганізацый, камунальных службаў выканкамаў па арганізацыі ўтрымання дарог і вуліц у зімовых умовах. У прыватнасці, будуць кантралявацца наяўнасць і тэхнічны стан машын і механізмаў, іх выкарыстанне, наяўнасць запасаў матэрыялаў супраць галалёду, у тым ліку на небяспечных участках дарог.

Аляксандр ПУКШАНСКІ.

ЗЯМЕЛЬНАЕ ПЫТАННЕ: ПРАВІЛЫ ГУЛЬНІ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

УЗЯЎСЯ ЗА ГУЖ...

70 зямельных участкаў, дзе не былі выкананы абавязацельствы па асваенні ў вызначаны заканадаўствам тэрмін, адабралі ў цяпер ужо былых уладальнікаў, паведаміў начальнік землеўпарадкавальнай службы Гродзенскага гарвыканкама Дзмітрый МАЦЯЮК.

— Пры прадастаўленні зямельных участкаў ва ўласнасць ставяцца ўмовы і па тэрмінах іх асваення, — тлумачыць Дзмітрый Мацяюк. — Юрыдычная асоба, прыватны прадпрымальнік на працягу шасці месяцаў, а грамадзянін — на працягу года з дня атрымання пасведчання аб дзяржаўнай рэгістрацыі зямельнага ўчастка павінны распачаць будаўніцтва. На землеўпарадкавальную службу ўскладзены абавязак адсочваць выкананне гэтай умовы. З улікам мікраараёнаў індывідуальнай жылой забудовы, якія цяпер фарміруюцца вакол Гродна, размова ідзе пра тысячы ўчасткаў.

— Як жа яны асвойваюцца?

— Калі скончыўся гадавы тэрмін, мы пацікавілася гэтым пытаннем у мікраараёнах індывідуальнай жылой забудовы Паўднёвы-5, Баранавічы-5 і 6. Увогуле было абследавана больш за 600 участкаў, і ўладальнікам тых надзелаў, дзе будоўля не распачата, а толькі расце пустазелле, уручылі прадпісанні. Пасля чаго на большасці ўчасткаў справа зрушылася з мёртвага пункта: узяліся за земляныя работы, планіроўку, сталі завозіць будматэрыялы. А некаторыя грамадзяне, усвядоміўшы, што не асіляць будоўлю, самі адмовіліся ад участкаў — такіх заяў было каля дваццаці. У тых сітуацыях, калі і праз месяц пасля выдачы прадпісання нічога так і не было зроблена, гэта фіксуецца актам, а потым прымаецца рашэнне аб адабранні зямельнага ўчастка.

— Здаралася, што такое рашэнне потым адмяняецца?

— Быў адзін выпадак. Прыходзіць абураны ўладальнік і кажа, што работы на ўчастку распачаліся, а значыць, адбіраць яго нельга. А нашы работнікі пацвярджаюць фотаздымкамі, што нічога там не рабілася. Не, кажа мужчына, давайце пакажу... Прыехалі на месца, адкапалі зямлю на штык рыдлёўкі, а там — фундамент, які ўладальнік участка зрабіў пяць гадоў таму. Мы палічылі, што асваенне ўчастка ўсё ж распачата, і рашэнне аб яго адабранні было адменена. Спадзяёмся, што цяпер чалавек актывізуе будоўлю.

— Якія затраты людзі нясуць, калі ў іх адбіраецца зямельны ўчастак?

— Ён жа перадаваўся бясплатна, ёсць толькі расходы па дзяржаўнай рэгістрацыі ўчастка, вырабе землеўпарадкавальнай дакументацыі. Вядома, што гэтыя затраты не кампенсуюцца, бо людзі не рэалізавалі права на ўчастак з-за сваёй неразваротлівасці. А ўжо расходы на рэгістрацыю спынення пры належнасці ўчастка гэтаму грамадзяніну бярэ на сябе выканкам за кошт бюджэту.

— Але ж, пэўна, бываюць і аб'ектыўныя прычыны прамаруджвання з працай на зямельным участку?

— Сапраўды, быў шэраг зваротаў грамадзян з просьбай прадоўжыць тэрмін асваення зямельнага ўчастка. Аднак якія матывы? Няма грошай на будаўніцтва? А што, праз месяц, які даецца на выкананне прадпісання, матэрыяльнае становішча раптам палепшыцца?

Хочацца звярнуць увагу індывідуальных забудоўшчыкаў на тое, што з сакавіка аднаўляецца дзеянне Указа Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 7 лютага 2006 года № 87 па пытаннях незавершанага будаўніцтва. Сутнасць яго ў тым, што ўстанаўліваецца трохгадовы тэрмін будаўніцтва жылога дома. За гэты перыяд павінны быць узведзены фундамент, сцены і дах — тады абавязкі забудоўшчыка лічацца выкананымі. Гэты тэрмін можа быць прадоўжаны мясцовым выканаўчым і распарадчым органам, але не больш чым на два гады — з улікам матэрыяльнага становішча грамадзяніна, яго хваробы, адсутнасці ў Беларусі і іншых паважлівых прычын па заяве (яна падаецца не раней, чым за шэсць месяцаў і не пазней, чым за два месяцы да заканчэння тэрміну будаўніцтва). Такое права ў дачыненні да канкрэтнага аб'екта можа быць рэалізавана толькі аднойчы. У выпадку немагчымасці завяршэння будаўніцтва ў прадугледжаны тэрмін грамадзянін абавязаны ажыццявіць кансервацыю жылога дома, дачы і добраўпарадкаванне зямельнага ўчастка, дзе яны размешчаны — згодна з парадкам, які ўстаноўлены ўрадам. Тэрмін кансервацыі не можа перавышаць трох гадоў.

— А што пагражае ў выпадку зрыву вызначанага тэрміну будаўніцтва суб'ектам гаспадарання?

— У Гродзенскім гарвыканкаме створана інвестыцыйная камісія, якая адсочвае ўсе аб'екты. Апошнім рашэннем прадугледжана, што калі аб'ект не здадзены ў вызначаны тэрмін, то прымяняецца штрафная санкцыя ў памеры 3 тысяч базавых велічынь. І тысяча базавых велічынь — за кожны наступны месяц пратэрміноўкі. Такія «правілы гульні» будуць дадатковым пагадненнем да існуючых дагавораў (на сёння ў абласным цэнтры каля дзясятка не ўведзеных своечасова аб'ектаў) і нормай пры заключэнні новых.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

«СВАІМ» — БЕЗ ЧАРГІ І АЎКЦЫЁНАЎ?

У Матыкальскім сельсавеце Брэсцкага раёна выяўлены сур'ёзныя парушэнні пры размеркаванні зямельных участкаў

У праваахоўныя органы звярнуліся жыхары Матыкальскага сельсавета з заявай аб тым, што ў прыгарадных вёсках парушаецца заканадаўства пры размеркаванні зямельных участкаў. Гэтае пісьмо было перададзена ў Камітэт дзяржкантролю Брэсцкай вобласці.

Як паведаміў нашаму карэспандэнту начальнік аддзела зваротаў грамадзян і арганізацыйнай работы абласнога КДК Віктар ВАСІЛЕЎСКІ, спецыялісты камітэта правялі пазапланавую праверку Матыкальскага сельвыканкама. Высветлілася, што парушэнне цягнецца з 2007 года, калі не было прынята адпаведнае рашэнне аб выдзяленні зямельных участкаў. Сельвыканкам проста... замоўчваў інфармацыю пра наяўнасць зямлі для забудовы ў вёсцы Цюхінічы. А названая вёска знаходзіцца ўсяго ў двух кіламетрах ад рысы абласнога цэнтра.

Толькі вось калі зямля не выдзялялася па заявах вяскоўцаў, якія маюць патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў і не прадавалася на аўкцыёнах, гэта зусім не азначае, што яна стаяла без гаспадара. Старшыня сельскага Савета, напрыклад, узяў адзін участак сабе, другі выдзеліў сыну, трэці атрымаў сын спецыяліста-землеўпарадкавальніка райвыканкама, які курыраваў названы сельсавет. Яшчэ ўчасткі атрымалі жыхары Брэста, якія ніколі не пражывалі ў населеных пунктах сельсавета. Адным словам, 13 зямельных участкаў плошчай 1,8 гектара былі выдзелены з парушэннямі заканадаўства. З-за таго, што аўкцыёны па продажы зямлі не праводзіліся, мясцовы бюджэт недаатрымаў значныя сродкі, у доларавым эквіваленце сума складае больш за 18 тысяч.

Па выніках праверкі Камітэта дзяржкантролю заведзена крымінальная справа ў дачыненні да старшыні сельвыканкама па частцы 3 артыкула 426 КК «Перавышэнне ўлады альбо службовых паўнамоцтваў». Аб гэтым пракурор вобласці Сяргей Хмарук паведаміў журналістам на прэс-канферэнцыі. На пытанне нашага карэспандэнта, што будзе далей з незаконна выдзеленымі ўчасткамі, Сяргей Хмарук адказаў, што цяпер ёсць два шляхі вырашэння праблемы. Першы варыянт — участак вярнуць, другі — найбольш прымальны ў гэтай сітуацыі, бо некаторыя паспелі пабудавацца — гаспадару зямельнага ўчастка заплаціць яго рынкавы кошт. Гэтыя пытанні будуць вырашаць адпаведныя службы аблвыканкама.

А вось справай старшыні сельскага Савета, які занадта вольна раздаваў зямлю, зараз займаецца абласное ўпраўленне Следчага камітэта па Брэсцкай вобласці. Кропкі над «і» тут паставіць суд.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

РАЗВЯЗАЦЬ ГОРДЗІЕЎ ВУЗЕЛ

Дэпутат парламента Валянціна Жураўская ўпэўнена, што разблытаць клубок набалелых праблем можна толькі супольна

Ала МАЧАЛАВА

Колькі акруг — столькі методык работы. Кожны дэлегат ад рэгіёна вынаходзіць свае ноу-хау для вырашэння праблем выбаршчыкаў. І робіць гэта па адметнай схеме. Дэпутату Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па прамысловасці, паліўна-энергетычным комплексе, транспарце, сувязі і прадпрымальніцтве Валянціне ЖУРАЎСКАЙ выявіць праблемы акругі дапамагае дзейнасць у Грамадскім пункце аховы правапарадку №4 Фрунзенскага раёна. Яна ж яго і ўзначальвае. Тэрытарыяльна грамадскі пункт і выбарчая акруга амаль супадаюць. У многім дзейнасць структуры завязана на рабоце школ — яны адсочваюць і непаспяховых былых навучэнцаў, і абавязаных бацькоў, якія маюць пазыку перад дзяржавай. Валянціна Жураўская сама ў мінулым узначальвала тамтэйшы прафесійна-тэхнічны каледж лёгкай прамысловасці. Таму ўсе зоркі сышліся: тут і звыклыя для яе праблемы, і знаёмая каманда.

Закон супраць дармаедства?

Хлопец, твару якога амаль не відаць з-за шаліка, нацягнутага да носа, і даўжэзнага чубка, што закрывае вочы, сядзіць перад саветам з апушчанай галавой. Ён даўно ўжо скончыў 9 класаў, нідзе не вучыцца і не працуе. Сам ён, па ўсім відаць, ад гэтага не надта пакутуе. За яго пакутуе маці. І шкада яе, і цяжка адчапіцца ад думкі, што сама не дагледзела. Складана зразумець, але гэта так: мама не можа справіцца з уласным сынам і спадзяецца на чужых дзядзькоў і цётак як на апошні паратунак...

Хлопца з даўжэзным чубам змяняе, здаецца, яго клон. Пасля яшчэ і яшчэ адзін. Такія ж штаны, якія боўтаюцца недзе бліжэй да кален, такія ж шалікі і чубкі — як шчыт ад знешняга свету. І праблема тыповая.

— Да мяне масава прыходзяць бацькі, чые дзеці даўно скончылі школу, але нідзе не вучацца і не працуюць, — дзеліцца дэпутат, якая праводзіць прыём раз на месяц у грамадскім пункце аховы правапарадку і ў адміністрацыі раёна. — Так, пакаранне за дармаедства, як гэта было пры СССР, у сучаснай Беларусі няма. І атрымалася, што ў гэтым дэмакратычным грамадстве з'явілася шмат утрыманцаў. Гэта датычыцца не толькі праблемных падлеткаў. Ёсць і дарослыя людзі, якія нічога не робяць. А за іх працуюць бацькі, дзядулі, бабулі. І гэта ўжо не асабістая праблема сям'і, дзе яго не змаглі належна выхаваць, а праблема ўсяго грамадства. Нам трэба абмяркоўваць і аналізаваць сітуацыю, ініцыяваць заканадаўчыя змены, якія ліквідавалі б утрыманства.

За праблемай утрыманства дэпутат бачыць магчымую пагрозу бяспецы грамадства. «Гэта патэнцыйныя зладзеі, п'яніцы, наркаманы. Ім няма чым заняцца, і яны могуць пайсці на правапарушэнне», — рэзонна заўважае Валянціна Жураўская.

Сістэмны падыход

Адну і тую ж праблему савет грамадскага пункта ў кожным выпадку вырашае індывідуальна. Тут ёсць і праваахоўнікі, і спецыялісты цэнтра занятасці, і педагогі, і сацыяльныя работнікі. Агульнымі намаганнямі яны выбіраюць найбольш аптымальнае выйсце з кожнай канкрэтнай сітуацыі. Дзяўчыну, якая ўжо наламала дроў не менш за любога гарэзу-пацана, вырашаюць уладкаваць на працу і ў вячэрнюю школу, каб рыхтавалася там да паступлення ў каледж. Хлопцам прапануюць курсы, якія дазволяць працаваць маляром-тынкоўшчыкам, плітачнікам-абліцоўшчыкам ужо літаральна праз паўгода.

— Трэба, каб ПТВ не закрываліся наглуха пасля 1 верасня. А такіх, як гэтыя падлеткі, забіралі на працягу года, — прыходзіць да высновы дэпутат. — Трэба рабіць выключэнні для маладых людзей, якія аказаліся ў бядзе. Мы, дарослыя, за іх у адказе.

Педагагічны вопыт дапамагае Валянціне Жураўскай знаходзіць падыход да кожнага няпростага падлетка. Дзяўчыне яна нагадвае пра яе прыгажосць і заклікае да жаноцкасці. Хлопцу, які стаіць на ўліку ў міліцыі, паведамляе, што ён не зможа выехаць за мяжу, і прапануе «здзелку» — зняцце з уліку ў абмен на добрыя паводзіны.

Яна беспамылкова вызначае, хто перад ёю і як уздзейнічаць на гэтага чалавека дзеля яго ж уласнай карысці: «каго можна гладзіць, а каго — калоць». Словы «паглядзіце, вашы дзеці вас саромеюцца!» могуць выцверазіць не самую лепшую ў свеце маму.

Жаночая інтуіцыя — добры дарадца ў многіх выццёвых сітуацыях. Але гэта не заўжды плюс. «Часам падлетку, які бравіруе, думае, што яму нічога не страшна, трэба, каб з ім па-мужчынску пагутарыў міліцыянер. Рэакцыя будзе зусім іншай, чым на жаночае слова». Трэба задзейнічаць усе сістэмы, пераканана дэпутат, тады будзе плён. «Кожны спецыяліст — гэта сувязное звяно, ён на сваім месцы развязвае нейкі вузялок. І толькі сумеснымі намаганнямі можна аднойчы разблытаць гордзіеў вузел. Уся мая работа ў акрузе пабудавана на гэтым».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

БЛІЗКАЯ ЎЛАДА

«У МЯНЕ ТАКІ ХАРАКТАР...»

Фота Ліліі ІЎЧАНКІ.

Дзіўны яна чалавек — моцны і ўразлівы адначасова. Быць моцнай ёй належыць па статусе: калі ў тваім падпарадкаванні 66 населеных пунктаў і амаль 2 тысячы насельніцтва, тут міжволі навучышся самадысцыпліне і самаарганізацыі. Гэтыя якасці, як і дзелавы касцюм, заўсёды прысутнічаюць у «гардэробе» жанчыны-кіраўніка. Што ж датычыцца ўразлівасці, чуллівасці і іншых «жаночых» складнікаў, на працы яны трансфармуюцца ў абвостранае пачуццё справядлівасці, а таксама ў шчырае жаданне паляпшаць, удасканальваць і ўпрыгожваць.

— Увогуле, я — чалавек вясковы, — кажа старшыня Язненскага сельскага Савета дэпутатаў Мёрскага раёна Валянціна ФЯДЗЬКОВІЧ. — Не люблю горад, усю гэту мітусню, натоўп, патокі машын... Калі і трапляю туды, увесь час цягне дадому, у Язна. Я ўсіх тут ведаю: хто чым дыхае, хто пра што думае... Людзі ў нас цікавыя, незвычайныя, неабыякавыя. Таму і працаваць з імі прыемна, і жыць сярод іх.

Як і любога іншага кіраўніка ўлады, Валянціну Мікалаеўну насельніцтва не толькі хваліць. Але яна ставіцца да гэтага спакойна, узгадваючы выказванне Карнэгі: як бы ты ні дзейнічаў — усё роўна палова будзе за цябе, а палова супраць. Значыць, рабіць трэба так, як лічыш патрэбным.

ПАЧАТАК

— Дзесяць гадоў таму ідзеш, бывала, па Язне — позірк няма на чым спыніць: шэрыя хаты, старыя непафарбаваныя агароджы, пра кветкі размовы няма... Сумнае відовішча. Не думала, што менавіта мне давядзецца ўсім гэтым займацца, бо працавала тады сацыяльным педагогам. Аднак з 2006 года, калі стала старшынёй Савета, давялося, — узгадвае Валянціна Мікалаеўна.

Першыя ўражанні ад працы аказаліся далёкімі ад станоўчых. Язненскі сельсавет — адзін з самых вялікіх у Мёрскім раёне. Населеных пунктаў — аж 66, грамадскіх могілак — 29. Несанкцыянаваных звалак на тэрыторыі — хоць гаць гаці; могілкі, асабліва ў Язне, спрэс зараслі кустоўем. Адміністрацыйны будынак сельвыканкама апошні раз рамантаваўся ў 80-м, стан тэрыторыі вакол яго пакідае жахлівае ўражанне... Пры гэтым грошай на добраўпарадкаванне ў сельсавецкім бюджэце — ні капейкі...

Адзін у полі не воін. Так з'явілася ідэя сабраць «войска». Яна сабрала ўсіх кіраўнікоў мясцовых арганізацый, абмеркавала разам з імі, як прывесці тэрыторыю ў нармальны стан, і рашэннем сельвыканкама быў вызначаны адзіны для ўсіх «санітарны дзень» — 3-я пятніца кожнага месяца.

— Спецыяльна да гэтага дня мы складалі план: хто які ўчастак прыбірае. ДРБУ, падраздзяленне ЖКГ, меліярацыйная станцыя (ПМС), школа — для ўсіх знаходзілася праца. Маёй справай было іх арганізаваць, вызначыць прыярытэты і расставіць сілы. Зразумела, усе працавалі бясплатна: высякалі, пілавалі, выносілі, чысцілі... Колькі ўсяго вывезлі — жах! Да ідэала яшчэ і сёння тэрыторыю не давялі, але, па вялікім рахунку, «санітарны дзень» нас выратаваў — на тыя ж могілкі цяпер без страху зайсці можна.

Я СКАЗАЛА «НЕ»!

Калі прыбраць тэрыторыю без фінансавых выдаткаў яшчэ так-сяк можна было, то паставіць новую агароджу — не. Хіба што спонсара знайсці, але са спонсарамі ў Язненскім сельсавеце не густа.

— Ранейшы старшыня райвыканкама лічыў, што сельскім Саветам грошы на добраўпарадкаванне даваць не трэба — яны, маўляў, не змогуць імі з розумам распарадзіцца. Не трэба дык не трэба, мы працавалі і без грошай. А ў 2008-м, калі ў Язне будаваўся аграгарадок, атрымалі раптам 30 мільёнаў рублёў ад цэнтра занятасці — на той час вялізную суму.

Іншыя сельсаветы, у якіх таксама пачалі з'яўляцца грошы на добраўпарадкаванне, кінуліся ставіць уздоўж цэнтральных вуліц новыя агароджы. Ёй прапанавалі заняцца тым жа. Яна адказала катэгарычна: «Не!». Калі паставіць чалавеку агароджу за дзяржаўныя сродкі, ён, па-першае, не ацэніць гэта, а па-другое, будзе і далей чакаць, што нехта яе пафарбуе ці парамантуе.

— Я сказала: за бюджэтныя грошы мы будзем добраўпарадкоўваць грамадскія могілкі ў Язне. І ўсе грошы пайшлі на іх агароджу. З таго часу брыгада ад цэнтра занятасці працуе на добраўпарадкаванні могілак пастаянна — фарбуюць, прыбіраюць, падкошваюць. А цэнтр выдаткоўвае на гэта грошы — па 8—10 мільёнаў за сезон.

НА «БІС»

Нягледзячы на ўсе цяжкасці і выдаткі, Валянціна Мікалаеўна любіць сваю працу. І не ўяўляе жыцця без малой радзімы з яе вялікай гісторыяй (нядаўна вёска Язна адзначыла 535-годдзе). Не любіць старшыня сельскага Савета занядбанасці, сімвалам якой доўгі час, да яе прыходу, служыў напаўразвалены бетонны ганак адміністрацыйнага будынка мясцовай улады.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

РАЗВЯЗАЦЬ ГОРДЗІЕЎ ВУЗЕЛ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)

А ў чым персанальная роля дэпутата?

— Мы можам звяртацца ў суды, вышэйшыя органы ўлады, наўпрост працуем з адміністрацыяй раёна. Можам не проста рэагаваць, а хутка ўмешвацца і дамагацца жаданага выніку, — мяркуе Жураўская.

Яна разумее, што мала проста «разграбаць» тое, што ўжо завалена. Варта адразу не дапускаць такога. «Больш па прафілактыцы працаваць. Папярэджваць наркаманію, алкагалізм, злачыннасць». А пачынаецца ўсё, відаць, з сям'і. Малы свавольнік, з якім сёння не можа зладзіць мама, заўтра можа ператварыцца ў таго, хто ўжо не паддаецца ніякаму ўздзеянню...

Занадта ці ў самы раз?

Яшчэ цяжэй, чым з праблемнымі падлеткамі, бывае са складанымі бацькамі. Здавалася б, жорсткія захады справядлівыя ў дачыненні да тых, хто не клапаціўся пра ўласных дзяцей, бо за памылкі трэба плаціць. Але ці не прынясе празмерна жорсткі падыход адваротнага эфекту?

— Мой сын абавязаны па дэкрэце № 18. Ён старанна працуе, я рада, што ўсё ў яго нармалізавалася. Але 70% заробку ў яго забіраюць. На тыя астатнія 30, якія яму даюць на рукі, — пражыць вельмі цяжка, — просіць за сына пажылая жанчына.

— Мы абмяркоўваем гэта ў парламенце, пытанне на кантролі ў дзяржавы, — запэўнівае яе дэпутат.

Нельга не задумвацца пра тое, што чалавек, якому няма на што жыць, аднойчы можа пайсці на злачынства...

Без дэмагогіі

Работа грамадскага пункта выходзіць далей за кабінетныя зборы. «Гэта не клуб дэмагогаў, — запэўнівае Валянціна Жураўская. — Наша работа павінна ўвянчацца вынікам. Нам трэба на свае вочы ўбачыць сітуацыю. Мы рэгулярна праводзім тэматычныя рэйды».

У акрузе 10 інтэрнатаў. «Мы абследавалі ўсе. Высветлілі, хто там пражывае, каму патрэбна дапамога. Падключылі органы аховы здароўя. Некага выправілі ў санаторый, кагосьці — на прымусовае лячэнне. Знайшлі інваліда, які жыў адзін і не мог сябе абслугоўваць. Мы змясцілі яго ў спецыяльны інтэрнат, дзе пра яго паклапоцяцца».

На праблемы пажылой жанчыны, якой даводзіцца выхоўваць дваіх унукаў замест іх бацькоў, звярнулі ўвагу выканкама. Там адразу ж адрэагавалі — аказалі матэрыяльную дапамогу.

У адной неўладкаванай сям'і бацькі пазбаўлены бацькоўскіх правоў, і старэйшы хлопец, які вярнуўся з войска, выхоўвае малодшага. «Хлопца мы дапамаглі ўладкаваць на працу ў будаўнічую арганізацыю, а яшчэ дамовіліся з імі на рамонт кватэры, з якой тыя бацькі зрабілі немаведама што», — кажа народная выбранніца. Яна дадае, што станоўчае рашэнне не азначае, што пра сям'ю забываюцца. «Мы сочым за тым, як складваецца іх лёс надалей, пасля аказанай падтрымкі».

Свята, якое заўжды з табой

«Бытуе меркаванне, што шматдзетная сям'я — нейкая непаспяховая», — заўважае Жураўская. Памятаеце, як у цудоўнай кінастужцы з Наталляй Гундаравай крыўдна гучалі словы: «колькі гэтых Кругловых, і ўсе ў абносках ходзяць»?..

— Зараз шмат маладых сем'яў, дзе і трое, і чацвёра блізнятак з'явіліся на свет. У адным толькі нашым раёне 18 такіх. Цудоўныя шчаслівыя сем'і. Яны павінны быць узорам для іншых, — пераканана парламентарый.

На Каляды дэпутат падрыхтавала сюрпрыз для шматдзетных сем'яў. Акцыя «Стварай дабро» заручылася падтрымкай буйных айчынных вытворцаў. Сем'ям дасталося па мяху з падарункамі — абуткам, канцтаварамі, цукеркамі. «Ніводзін з 10 кіраўнікоў прадпрыемстваў, да якіх я звярнулася, не адмовіў мне», — згадвае дэпутат. А цяпер вось рыхтуецца буйное свята да 8 сакавіка. «Шматдзетныя таты вырашылі паказаць, як яны любяць сваіх жонак і дзяцей», — распавядае Жураўская. Урачыстае мерапрыемства так і назвалі: «Я люблю цябе, сям'я».

— У такой святочнай абстаноўцы, з музыкай, сюрпрызамі і падарункамі, мы пакажам людзям, як мужчына можа ставіцца да дома, сям'і.

Не ў сваёй акрузе

Працаваць, як у сваёй акрузе, Валянціне Жураўскай даводзіцца нават... не ў сваёй. Яна жыве ў Бараўлянах, і тамтэйшыя жыхары, ведаючы, што жанчына — дэпутат, ідуць да яе са сваімі праблемамі. «Там ужо 70 тыс. жыхароў, а інфраструктура па-ранейшаму, як у вёсцы. Дарогі ў жудасным стане», — расказвае дэпутат. Спачатку на яе звароты адказвалі фармальнымі адпіскамі. Тады народная выбранніца пайшла самым кароткім, нефармальным шляхам: «Я запрасіла гендырэктара «Мінаблдарбуда», і мы разам праехаліся па гэтых дарогах. Усе пытанні адпалі». Дэпутат, кажа, не можа бяздзейнічаць нават там, дзе, здавалася б, не яго сфера адказнасці: людзі змушаюць адкрываць вочы і дапамагаць.

Фота аўтара.

На прыёме ў грамадскім пункце аховы правапарадку.

«У МЯНЕ ТАКІ ХАРАКТАР...»

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС»)

— У 2010 годзе зрабілі нам, дзякуй Богу, рамонт — у холе, калідоры і актавай зале, крыху раней замянілі дах і вокны... Засталося кабінеты давесці да ладу. Словам, колькі працую, столькі і рамантуемся, — усміхаецца Валянціна Мікалаеўна.

Дарэчы, «кабінетнай» яе працу не назавеш. У Язне, як ні ў адной іншай вёсцы раёна, добра развіта інфраструктура — ёсць участковая бальніца, сярэдняя школа і садок, Дом культуры, музычная школа, комплексны прыёмны пункт, кавярня, некалькі крам, участак ЖКГ... Для кагосьці гэта звычайная «атрыбутыка» аграгарадка, для яе — неабходныя складнікі якаснага жыццезабеспячэння сельскага насельніцтва. У тых жа крамах асартымент прадуктаў не горшы, чым у горадзе. Прычым графікі прывозу адладжаны такім чынам, што мясцовыя жыхары заўсёды могуць набыць і свежы хлеб, і свежыя малочныя прадукты.

— А яшчэ ў нас ёсць «ноу-хау» — свой рынак. Некалі, у пачатку 90-х, ён стварыўся стыхійна, з ім ваявалі і санстанцыя, і падатковая інспекцыя. Але рынак выжыў, акультурыўся, яму знайшлі пастаяннае месца. Сёння там можна купіць і адзенне, і прадукты. У хуткім часе, думаю, збяром з падворкаў грошы, дададзім бюджэтных і паставім там новую агароджу. А яшчэ дамовімся з нашым ДРБУ і зробім нармальны пад'езд, каб людзям было зручна.

Пазалетась старшыня сельскага Савета рызыкнула і ўпершыню арганізавала на гэтым рынку сельскагаспадарчы кірмаш, каб вяскоўцы маглі на месцы купіць свойскую жывёлу і птушку, корм для іх, а таксама саджанцы, насенне і кветкі. З пастаўшчыкамі дамаўлялася сама, хоць і сумнявалася да апошняга, ці будзе попыт на тавар. Аказалася, хвалявалася дарэмна: тыя ж кветкі і саджанцы вяскоўцы «размялі» ўмомант. Прыйшлося летась паўтарыць кірмаш на «біс» — падобна на тое, што ён у Язненскім сельсавеце прыжывецца.

ЗАГАДАЦЬ... І ПРАГАДАЦЬ?

— У мяне характар такі: паставіла мэту — абавязкова даб'юся, хоць з грашыма, хоць без іх, — усміхаецца Валянціна Мікалаеўна. — Разумела, прыйшоўшы сюды, што на тэрыторыі сельсавета я, па вялікім рахунку, улада, але... улада без грошай і матэрыяльных рэсурсаў. Значыць, трэба наводзіць «масты», будаваць «палітыку ўзаемаадносін» з арганізацыямі і прадпрыемствамі, у якіх гэтыя грошы і рэсурсы ёсць.

Пэўны час яна вучылася дамаўляцца, тлумачыць і прасіць — так, каб не прыніжаць сваю годнасць і пры гэтым атрымліваць неабходнае (не кожнаму, між іншым, дадзены такія здольнасці). Адна з супрацоўніц райвыканкама аднойчы сказала ёй: «Вы ж — улада! Няўжо загадаць не можаце?!».

— Не ў нашым становішчы гэта рабіць, — лічыць Валянціна Фядзьковіч. — Загадаць той ці іншай службе можа старшыня райвыканкама ці райсавета. Я ж магу толькі пагаварыць з кіраўніком прадпрыемства, схіліць на свой бок, пераканаць у тым, што сельсавету неабходна яго дапамога.

У яе гэта атрымліваецца... Напрыклад, кожны старшыня сельскага Савета ведае, як складана арганізаваць спілоўванне аварыйных дрэў. У Валянціны Мікалаеўны гэта адбываецца так: кіраўнік ПМС дае ёй кран, пажарнікі — машыну, лясніцтва — спецыяліста-рэзчыка... І галоўнае — яна нікому нічога не плаціць.

— Мне пашанцавала — мала таго, што на нашай тэрыторыі знаходзіцца некалькі прадпрыемстваў і арганізацый, дык іх кіраўнікі яшчэ і разумеюць праблемы сельсавета.

БЯДА

Жыццё сельсавета складаецца не толькі з агульных праблем тэрыторыі, але і з асобных патрэб кожнага чалавека. Што характэрна, Валянціне Фядзьковіч удаецца знаходзіць адказы практычна на ўсе пытанні «сваіх» жыхароў, нават на такія казытлівыя, якія датычацца прадастаўлення рознага кшталту льгот.

— Тлумачу, напрыклад, чаму адным можна купляць паліва па льготнай цане, а іншым — нельга. Доўга тлумачу, цярплівa, часам не па адным разе, каб папярэдзіць магчымыя крыўды.

Але яе такія размовы зусім не напружваюць, хоць і забіраюць шмат энергіі і часу.

— Напэўна, усё гэта сапраўды «маё». Мне прыносіць вялікае задавальненне ўсведамленне таго, што я дапамагла чалавеку, хаця б словам.

Адзінае, бадай, што сапраўды напружвае — сітуацыя з «цяжкімі», неўладкаванымі сем'ямі і адчуванне безвыходнасці, якое з'яўляецца пасля іх наведвання. Некаторыя неўладкаваныя, здараецца, напрамкі ідуць да яе ў кабінет — просяць, каб дала грошай, каб пакарміла...

— Летась з трох сацыяльна небяспечных сем'яў дзяцей забіралі ў прытулак... Ёсць бацькі, якія перажываюць. Ёсць тыя, каму «да ліхтара»... Мы ў сельскім Савеце нават «круглы стол» з такімі маці праводзілі, запрашалі псіхолага і святара. Бацюшка потым яшчэ і малебен за іх здароўе адслужыў.

Калі б людзі не выпівалі, упэўнена Валянціна Мікалаеўна, жылі б нашмат лепш. Гэта самая вялікая праблема і бяда вёскі. У горадзе яна таксама існуе, але не так кідаецца ў вочы. А ў вёсках народу мала, і кожны навідавоку.

НЕ БРАСЛАЎШЧЫНА, АЛЕ...

Валянціна Фядзьковіч не была б кіраўніком, калі б не думала пра будучыню — і сваёй тэрыторыі, і людзей, якія тут жывуць. Яна напісала хадайніцтва аб тым, каб у Язне дазволілі прадаваць участкі з аўкцыёна... Спадзяецца, што з цягам часу зямля тут будзе запатрабаваная. Урэшце рэшт, на тэрыторыі сельсавета ёсць два возеры — магчыма, не такія шыкоўныя, як на Браслаўшчыне, але ўсё ж... Старшыня сельскага Савета збіраецца ў хуткім часе зрабіць свой сайт у інтэрнэце і пачаць рэкламную «раскрутку». Спадзяецца, што пакупнікі на ўчасткі абавязкова знойдуцца.

— Вось заселяць людзі ўсе тыя тэрыторыі, якія прылягаюць да сталіцы і абласных цэнтраў, і пачнуць прыязджаць да нас, — кажа яна. — Так што будучыня ў Язна ёсць, я дакладна гэта ведаю.

Наталля КАРПЕНКА.

ТРЫ ПЫТАННІ

БУДУЕЦЦА ГОРАД

У Баранавічах з 6 па 20 лютага праводзілася грамадскае абмеркаванне плана забудовы новай часткі жылога мікрараёна «Паўночны». Такі мікрараён у горадзе ёсць, але ў адпаведнасці з планам ён будзе пашыраны і зойме плошчу ў 272,4 гектара. Пражываць ва ўзведзенай частцы «Паўночнага» будзе амаль 18 тысяч чалавек. Але наколькі рэальная такая будоўля?

Пытанні былі пастаўлены перад намеснікам галоўнага архітэктара горада Баляславам ТУМАШЧЫКАМ.

— Баляслаў Іосіфавіч, што будзе ўяўляць сабой новая забудова?

— Каля 80% забудовы «Паўночнага» будуць складаць шматкватэрныя дамы — а гэта амаль 8,3 тысячы кватэр. Плюс 120 дамоў сядзібнага тыпу. Будзе ўзведзены Палац водных відаў спорту, гасцініца, гандлёвы цэнтр, супермаркеты, за Лядовым палацам з'явіцца спартыўныя пляцоўкі, парк і, вядома ж, сярэдняя школа, дзіцячыя садкі...

— На ажыццяўленне такога плана патрэбен час і вялікія грошы. Ці ёсць яны ў горада?

— Генплан разлічаны да 2020 года. Будзе распрацаваны праект шматкватэрнай забудовы мікрараёна, і калі не надарыцца эканамічных катаклізмаў, то праз тры гады будаўніцтва пачнецца. Безумоўна, неабходны фінансы, але будоўля павінна ісці планамерна — з года ў год. Узводзіцца новая частка «Паўночнага» будзе за кошт бюджэту, інвестыцый і сродкаў грамадзян. Яшчэ раз адзначу, што не ўсё з'явіцца адразу. Напачатку будуць падведзены інжынерныя камунікацыі: цеплатраса, водаправод, лініі энергазабеспячэння, а затым пачнецца ўзвядзенне аб'ектаў у тры этапы. У горада ёсць магчымасць асіліць такую будоўлю. Калі ў лепшыя гады ў савецкі час у Баранавічах узводзілі за год 80 тыс. м², то ў найноўшы перыяд існавання горада (да леташняга фінансавага абвалу) у Баранавічах будавалі 130 тыс. м² жылля.

— У фае гарвыканкама быў выстаўлены на абмеркаванне грамадскасці праект забудовы «Паўночнага». Насельніцтва праявіла да яго цікавасць?

— Не магу сказаць, што народ актыўна падключыўся да абмеркавання, але выказванні былі. Напрыклад, была прапанова, каб больш увагі пры будаўніцтве надалі ўезду ў горад. І тут ёсць рацыянальнае зерне, бо менавіта праз «Паўночны» ўязджаюць у горад з боку Мінска і Брэста. Толькі падкрэслю, што абмеркаванне яшчэ не закончана. Існуе камісія на чале з намеснікам старшыні гарвыканкама Валерыем Лазіцкім, у якую ўваходзяць розныя спецыялісты, і ўсе прапановы будуць разгледжаны.

Сымон СВІСТУНОВІЧ.

АДЗІН ЛЕПШ, ЧЫМ ДВА?

Камітэт дзяржкантролю Гомельскай вобласці правёў маніторынг эфектыўнасці працы ўстаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі.

Сёння ў Гомелі працуюць два аднапрофільныя цэнтры турызму і краязнаўства для дзяцей і моладзі — абласны і гарадскі. Высветлена, што пры наяўнасці ў Гомельскага гарадскога цэнтра будынка агульнай плошчай амаль 890 кв.м, адукацыйны працэс праходзіць не ў ім, а на базе ўстаноў адукацыі горада, а навучальныя трэніроўкі — у турысцка-спартыўнай зале Гомельскага абласнога цэнтра турызму. Памяшканні гарадскога цэнтра выкарыстоўваюцца галоўным чынам як турыстычная база для пражывання ўдзельнікаў спаборніцтваў і збораў. Пры гэтым за мінулы год на ўтрыманне ўстановы было выдаткавана 586 млн руб. бюджэтных сродкаў. Такім чынам, лічаць у КДК, наяўнасць у Гомелі двух аднапрофільных цэнтраў турысцка-краязнаўчага кірунку не спрыяе эфектыўнаму выкарыстанню бюджэтных сродкаў на іх утрыманне, а таксама максімальнаму выкарыстанню дзяржаўнай маёмасці. Падчас маніторынгу 10 устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі Гомельскай вобласці выяўлены шэраг недахопаў у іх працы.

Ірына АСТАШКЕВІЧ.

ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск»

извещает своих акционеров о проведении 23 марта 2012 года очередного общего собрания акционеров

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет дирекции об итогах финансово-хозяйственной деятельности общества в 2011 году и основных направлениях развития общества на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности общества за 2011 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках общества за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли (покрытии убытков) и выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли, которая будет получена в 2012 году.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
8. Утверждение размера вознаграждений членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Об увеличении уставного фонда общества.
10. Об утверждении решения о выпуске акций общества.
11. О внесении изменений и дополнений в Устав общества.

Собрание состоится в 15.00 в здании ЧУП «Витебский учебный центр профсоюзов» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 8а, 2-й этаж.

Список акционеров для регистрации участников собрания будет составлен по состоянию реестра на 1 марта 2012 г.

Регистрация акционеров проводится с 14.00 до 14.45.

Акционерам при себе иметь паспорт, представителям — доверенность.

Справки по телефону (8 0212) 37 28 93.

С материалами собрания можно ознакомиться с 1 марта 2012 года в общем отделе ОАО «Строительный трест № 9, г. Витебск» по адресу: г. Витебск, ул. «Правды», 5.

УНП 300029266

Наблюдательный совет

ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОННЫХ ТОРГОВ ПО ПРОДАЖЕ ПРАВА ЗАКЛЮЧЕНИЯ ДОГОВОРОВ АРЕНДЫ ЗЕМЕЛЬНЫХ УЧАСТКОВ в г. БРЕСТЕ

№ лота	Адрес участка/кадастровый номер	Кадастровый номер 1401000000	Общая площадь (га)	Целевое назначение использования участка	Срок аренды, лет	Начальная цена предмета аукциона (руб.)	Сумма задатка (руб.)	Расх. по подг. земел.- кадастр. док. (руб.)	Характеристика инженерных коммуникаций и сооружений на участке
1	ул. 28 Июля	1027132	3,6204	для строительства и обслуживания объекта торговли	10	4 396 468 133	879 290 000	2 511 113	ограничений в использовании земель нет
2	ул. Мошенского	1027133	0,0015	для установки и обслуживания торгового павильона	10	1 766 345	353 000	2 310 280	ограничений в использовании земель нет
3	ул. Октябрьской Революции (по ГП № 61 в микр. «ЮВМР-1»)	1013899	0,4100	строительство и обслуживание жилого многоквартирного дома с элементами повышенной комфортности со встроенными многофункциональными объектами (социально-культурного назначения и торговли)	10	439 781 964	87 950 000	133 823	ограничений в использовании земель нет
4	№ 6 (по ГП) согласно ПДП «Вычулки-Ямно»	1027196	0,0748	строительство и обслуживание объекта торговли и общественного питания	10	40 602 030	8 120 000	2 627 392	ограничений в использовании земель нет
5	ул. Речицкая	1027193	0,0020	установка и обслуживание торгового павильона в комплексе торговых павильонов	10	2 659 229	530 000	2 428 862	ограничений в использовании земель нет
6	в районе ул. Ковельской, 85	1027194	0,0096	строительство и обслуживание магазина продовольственной группы товаров	10	8 189 347	1 630 000	2 548 273	ограничений в использовании земель нет
7	в районе ул. лейтенанта Рябцева	1027195	0,1316	строительство и обслуживание станции технического обслуживания автомобилей	10	66 770 903	13 350 000	2 682 457	ограничений в использовании земель нет
У красавіку 2010 года мы таксама заняліся камерцыйнай дзейнасцю — сёння яна развілася ўжо вельмі добра і прыносіць свае плады. Напрыклад, калі ў 2010 годзе валавы таваразварот па камерцыйнай дзейнасці складаў каля 5 мільярдаў рублёў, то па выніках 2011 года — ужо каля 27 мільярдаў.

Улічваючы гэта, мы вымушаны пашырацца — павялічылі штат супрацоўнікаў (калі раней было 23-24 чалавекі, то сёння — ужо больш за 30), узялі чатыры кабінеты ў арэнду. Дарэчы, адзін з гэтых кабінетаў выкарыстоўваем пад аўкцыённы зал. Бо ў нас два разы на месяц праходзяць аўкцыёны, і кожны раз прасіць залу ў «Белрэсурсаў» не атрымліваецца, бо ў іх там свае тэндары праходзяць.

— У вас даволі амбіцыйныя планы па рэалізацыі на 2012 год. Але, з улікам эканамічнага становішча, ці захаваецца попыт на былую ў карыстанні вайсковую маёмасць?

— Я не думаю, што з-за нейкіх перыпетый у эканоміцы ў нас не будзе пакупнікоў. Бо новая тэхніка вельмі дарагая, і не кожная арганізацыя можа дазволіць сабе яе закупіць. Таму попыт на былую ў карыстанні тэхніку расце з кожным годам. Тым больш — вайсковую, бо ўсё-такі Савецкі Саюз для ваенных арганізацый тэхніку рабіў грунтоўна. Возьмем, напрыклад, той жа «УАЗік» — хадавая частка ваенных «УАЗікаў» больш магутная і зроблена больш старанна, чым у цывільных машынах. З гэтага і зыходзяць людзі, калі звяртаюцца да нас па тэхніку — а ў нас, дарэчы, яе набываюць і дзяржаўныя арганізацыі, і прыватныя фірмы, і калгасы, і будаўнічыя арганізацыі, і нават фізічныя асобы. Прывяду прыклад, якім можна праілюстраваць попыт на тэхніку: нядаўна на аўкцыёне «КамАЗ» пры пачатковым кошце ў 35 мільёнаў быў прададзены за 220 мільёнаў, што прыкладна роўна 25 тысячам долараў. Так што, калі людзі купляюць — значыць, маёмасць карыстаецца попытам і грошы ў іх ёсць. Я заўсёды казаў і буду казаць, што ў Беларусі народ у цэлым жыве добра — лепей, чым у Расіі. І хоць я сам з Расіі, езджу туды кожны год, але гляджу, што беларускаму народу грэх на нешта крыўдзіцца.

— Як часта ў вас праводзіцца пераацэнка маёмасці? За інфляцыяй у мінулым годзе паспявалі?

— Маёмасць мы пераацэньваем штомесяц у адпаведнасці з пастановай Савета Міністраў: Нацыянальны статыстычны камітэт распрацоўвае спецыяльныя індэксы, з 17 па 19 число прадастаўляе іх нам, і ў адпаведнасці з імі мы праводзім пераацэнку. Калі казаць пра 2011 год, то прывяду прыклад: са студзеня па сакавік машына «ГАЗ-66» каштавала каля 4-5 мільёнаў, а сёння — ад 8 да 13 мільёнаў. Але калі палічыць у доларавым эквіваленце, то, у прынцыпе, цана засталася тая ж самая.

— Дарэчы, тэхнікі ў сілавых органаў яшчэ шмат? Усім хопіць?

— Скажам так — яе яшчэ дастаткова. На два-тры гады рэалізацыі дакладна хопіць. Ну а потым, паколькі ідзе пастаянная мадэрнізацыя і замест састарэлай закупляецца новая тэхніка, прыйдзе чарга і да гэтай, больш новай тэхнікі. Так што кругаварот такі будзе ў поўнай ступені пастаянным.

— У мінулым годзе некаторыя прадпрыемствы мелі праблемы з набыццём валюты. Вас гэта не закранула?

— Большую частку маёмасці мы прадаём на ўнутраным рынку, але нам таксама даводзіцца план і па заробку валюты для дзяржавы. Летась ён склаў каля 1,1 мільёна долараў. Фактычна па выніках года мы зарабілі 1,32 мільёна долараў — такім чынам нават перавыканалі план. Сёлета перад намі ўжо стаіць задача зарабіць валюту ў памеры 1,27 мільёна долараў. Пакуль у нас з выкананнем гэтага задання праблем няма — за студзень-люты мы ўжо ў бюджэт зарабілі каля 350 тысяч долараў. Таму стараемся, калі ёсць магчымасць, прадаваць маёмасць у Расію, каб неяк забяспечыць дзяржаўны бюджэт валютнымі сродкамі.

Але часам па камерцыйнай лініі прыходзіцца самім закупляць расійскія рублі для пастаўкі той ці іншай прадукцыі для беларускіх прадпрыемстваў. Напрыклад, у канцы мінулага года з адной арганізацыяй заключылі кантракт на пастаўку труб, для чаго нам спатрэбілася набыць каля трох мільёнаў расійскіх рублёў. Але, нават нягледзячы на такую вялікую суму, сальда знешняга гандлю па выніках 2011 года ў нас атрымалася станоўчае — плюс 668 тысяч долараў, што робіць гонар прадпрыемству. Хоць па плане нам дазвалялася нават адмоўнае сальда ў памеры 500 тысяч долараў.

— Хто яшчэ, акрамя Расіі, цікавіцца маёмасцю, якая вызваляецца ў ваенных і іншых сілавых органаў?

— Таксама купляюць украінскія фірмы, а летась гандлявалі са Славеніяй. Славенцы бралі некандыцыйныя маслы ІХП-3 і змазку «Літол-24». У чым там была неабходнасць у такой прадукцыі — я не ведаю. Але калі бяруць — калі ласка. А ўкраінцы звычайна купляюць грузавікі, трансмісіі і іншыя запчасткі.

— Аўкцыёны, якія вы праводзіце, даюць свой плён?

— Праз аўкцыёны мы рэалізуем пэўныя катэгорыі тавараў па спісах, зацверджаных Міністэрствам гандлю. Гэта пераважна тэхніка, якая карыстаецца попытам — «КамАЗы», «Уралы», а таксама аэрадромныя пліты 3 і 4 катэгорыі. Таксама праз аўкцыёны можам рэалізоўваць і іншую маёмасць, якой зацікавіцца вельмі шмат пакупнікоў. І такая практыка сябе апраўдвае: калі тры-чатыры чалавекі хочуць купіць «ЗІЛ-131», то яго цана ў выніку можа вырасці нават у некалькі разоў. Ці вось 18 студзеня адбыўся аўкцыён, на які мы выстаўлялі чатыры МТ-ЛБу (дэмілітарызаваныя браніраваныя машыны). І яны пры агульным пачатковым кошце каля 240 мільёнаў былі рэалізаваныя за 1,22 мільярда рублёў. Дарэчы, вяртаючыся да пытання пра валюту, гэтыя МТ-ЛБу закупілі дзве расійскія кампаніі, натуральна, за расійскія рублі. Таму, як бачыце, аўкцыёны праходзяць вельмі эфектыўна.

— Асартымент маёмасці, якую рэалізуе РУП «Белспецкантракт», вельмі вялікі. Ёсць і такія тавары, якія я нават не магу прыдумаць, каму могуць спатрэбіцца: скажам, вайсковыя гузікі, пагоны і г. д. Як лічыце, мо ёсць сэнс гэтую прадукцыю не рэалізоўваць, а проста выкінуць ці перапрацаваць?

— Выкінуць можна заўсёды. Перапрацаваць — наўрад ці. Але я скажу, што тым не менш уся маёмасць паціху прадаецца — і эмблемы, і гузікі, і зоркі, кукарды, пагоны. Бывае, закупляюць нейкія дзіцячыя ўстановы, але звычайна гэта набываюць або індывідуальныя прадпрымальнікі, або фізічныя асобы. Для чаго — я, шчыра прызнаюся, не ведаю. Самае галоўнае, што ў нас купілі і заплацілі грошы, якія пайшлі ў бюджэт. Гэта асноўная ідэя існавання нашага прадпрыемства — зарабіць як мага болей грошай у бюджэт.

— На вашым сайце вісіць поўны пералік ўсёй маёмасці, якую можна набыць у РУП «Белспецкантракт». Інтэрнэт сёння іграе вялікую ролю ў рэалізацыі?

— Раней, калі толькі-толькі пачыналася рэалізацыя маёмасці праз гэтае прадпрыемства, пра «Белспецкантракт» мала хто ведаў. І таму ў 2006 годзе мы друкавалі рэкламу ў 30 выданнях і затрацілі на гэта 68 мільёнаў рублёў. Калі людзі даведаліся, што існуе наша прадпрыемства і гандлюе такой маёмасцю, тады народ павалі. Дарэчы, у 2006 годзе я кожны квартал даваў справаздачу перад Саўмінам, бо прадпрыемства працавала першы год і ва ўрадзе хацелі паглядзець — справімся мы ці не. У прыватнасці, за 2006 год трэба было зарабіць 15,1 мільярда рублёў. У выніку мы з задачай справіліся і нават перавыканалі план — зарабілі цэлых 15,6 мільярда. Што тычыцца сённяшняга дня, то зараз нам шырокая рэклама не патрэбна: мы друкуем інфармацыю ў двух-трох выданнях. А нядаўна правялі апытанне сярод нашых пакупнікоў, у якім папрасілі адказаць на пытанне, дзе яны знайшлі інфармацыю пра нашае прадпрыемства. І недзе каля 80% адказалі, што ўсё-такі ў інтэрнэце. Народ хоча купіць добрую машыну і патанней, а паколькі да нас ідуць, значыць, можна зрабіць выснову, што ў гэтым запатрабаванням адпавядаем.

— Калектыў у вас невялікі, але, наколькі я паспеў заўважыць, дружны. Дый на сайце ў вас напісана, што вакансій няма — відаць, зарплата добрая?

— Сапраўды, зарплата ў нас параўнальна добрая і вакансій няма. Праўда, у 2009 годзе прыйшлося абмяжоўваць выплаты за высокія дасягненні і прэміі — тады, напэўна, ва ўсіх было цяжкае становішча. Але скажу, што я вельмі задаволены сваімі людзьмі і сваімі калегамі: нават у гэтыя цяжкія часы ніводны работнік не звольніўся. Хвала і пашана ім за гэта, што не кінулі ў цяжкую хвіліну. Потым сітуацыя выправілася, і ў 2010-2011 гадах становішча было лепшым. Дарэчы, паколькі летась курс долара рэзка вырас, мы знайшлі сродкі і тры разы павялічвалі зарплату. А параметры аб'ёмаў работ, што выконваюцца, і таваразварот дазваляюць падумаць пра тое, каб па выніках працы за 1 квартал 2012 года павысіць стаўку першага разраду.

— Хто складае касцяк калектыву? Моладзі шмат?

— Ёсць і моладзь. Вось нядаўна ўзялі эканаміста: дзяўчына толькі што з інстытута, вопыту няма, нідзе не бяруць працаваць — а мы ўзялі. Бо яна — дачка ваеннаслужачага. І я стараюся браць да сябе або былых вайскоўцаў, або членаў іх сем'яў. Бо ў Савецкім Саюзе жонкі і дзеці вайскоўцаў былі ў незайздросным становішчы — сёння жывуць тут, а заўтра — за тысячы кіламетраў. Таму ні вучыцца, ні працаваць ім нармальна нельга было. І зараз падчас службы афіцэру даводзіцца мяняць некалькі гарнізонаў, і не ў кожным з іх ёсць школа. Таму стараемся браць менавіта такіх людзей, да таго ж мы шчыльна звязаны па працы з сілавымі органамі. Дарэчы, у нас практычна ўсе мужчыны — ваеннаслужачыя запасу: ёсць і падпалкоўнікі, і маёры, і прапаршчыкі, а ў асноўным — палкоўнікі.

Вядучы спецыяліст па камерцыйнай дзейнасці Андрэй ГОРЫН.

Найбольш цяжка было ў 2006 годзе, калі я толькі падбіраў кадры: трэба было знайсці падыход да кожнага, здружыць і згуртаваць калектыў. І мне здаецца, калі нават у цяжкія хвіліны ніхто мяне не пакінуў, выканаць пастаўленую задачу ў мяне атрымалася. Па-другое, я вельмі вялікую ўвагу звяртаў на тое, каб работнікі былі некарумпаваныя. Бо вельмі шмат людзей, якія нешта хочуць купіць і тут жа прапануюць дадаткова яшчэ заплаціць супрацоўнікам. Таму на пачатковым этапе былі пэўныя складанасці і прыходзілася ад некаторых старых супрацоўнікаў пазбаўляцца. Дый зараз пры прыёме на працу я ў першую чаргу акцэнтую ўвагу на тое, што калі чалавек хоча зарабляць не тым метадам, якім трэба, то лепей сюды не прыходзіць. Мне не трэба, каб які-небудзь работнік прадпрыемства трапіў на лаву падсудных.

— Вы кіруеце прадпрыемствам з 2006 года, да гэтага таксама мелі вопыт працы ў фінансавай сферы. Скажыце, а вам ніколі не хацелася распачаць свой бізнэс?

— Каб працаваць у бізнэсе і адкрываць нешта сваё, патрэбен асаблівы талент. Не ўпэўнены, што ў мяне ён ёсць.

— Але ж вы, па сутнасці, таксама кіруеце бізнэсам, але не сваім, а дзяржаўным...

— Не, усё адно я для сваёй справы непадрыхтаваны, дый, шчыра кажучы, не хачу. Я ў мінулым прафесійны інспектар-рэвізор і прывык да заканадаўства — цвёрдага і жорсткага. Таму і ў кіраванні «Белспецкантрактам» я прытрымліваюся гэтых прынцыпаў — каб усё было ў адпаведнасці з законам, жорстка і цвёрда. Я прывык падпарадкоўвацца загадам, мне гэта неяк бліжэй да сэрца.

— Наколькі я ведаю, ваша прадпрыемства таксама па меры магчымасці займаецца дабрачыннасцю?

— Так, калі звяртаюцца людзі, дапамагаем хворым дзецям. На пастаяннай аснове супрацоўнічаем з дабрачыннай арганізацыяй «Вера, Надзея, Любоў». Таксама ўдзельнічаем і ў іншых праектах. Напрыклад, дзяржаўнае прадпрыемства «Белрэсурсы» зараз будзе будаваць завод па перапрацоўцы бою шкла. Аналагаў такога завода ні ў Расіі, ні ва Украіне няма. І яны звярнуліся па пазыку да прадпрыемстваў, якія ўваходзяць у склад аб'яднання, каб трохі зняць бюджэтную нагрузку. Частку грошай мы ўжо ім пералічылі, потым будзем яшчэ пераводзіць.

Таксама зараз ідзе вялікая спонсарская кампанія па будаўніцтве новага будынка музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У мяне, дарэчы, у гады вайны бацька і дзядзька вызвалялі Беларусь, таму, напэўна, я калісьці, яшчэ зялёным лейтэнантам, і патрапіў у Беларусь служыць. А зараз, калі дабудаўся пра кампанію, я адразу сказаў, што трэба разгледзець гэтае пытанне і абавязкова аказаць спонсарскую дапамогу па будаўніцтве музея ВАВ. Мы, дарэчы, добра ведаем адзін аднаго з дырэктарам музея Сяргеем Азаронкам, таму па магчымасці будзем музею дапамагаць.

Павел БЕРАСНЕЎ, Алена ДАЎЖАНОК. Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.

З ДНЁМ АБАРОНЦАЎ АЙЧЫНЫ!

Дарагія калегі, партнёры, сябры і знаёмыя! Віншую вас з Днём абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь! Зычу вам здароўя, поспехаў ва ўсім — і ў жыцці, і ў такой нялёгкай і адказнай працы — ваеннай службе.

Асаблівыя віншаванні – маім саслужыўцам і ўсім афіцэрам краіны, бо афіцэр – гэта гордасць Айчыны і гордасць сям'і. І пакуль існуюць афіцэрскія сумленне, доблесць і гонар – дагэтуль ніводны вораг не пасмее пасягнуць на свабоду і незалежнасць нашай любімай Радзімы!

Дырэктар Алік АЙЗАТУЛІН.

Інспектар па кадрах Гражына МЕЛЬНІКАВА.

Вядучы спецыяліст упраўлення рэалізацыі Марыя ПАЛКІНА з пастаянным пакупніком Сяргеем ПАВАЛЯЕВЫМ.

Начальнік планава-разліковага сектара Віктар КОР'ЕЎ, вядучы эканаміст Іна ГАНЧАРОВА, вядучы інжынер Таццяна МАРОЗАВА.

Галоўны бухгалтар Ірына УТКІНА і яе калегі: Таццяна САЛАВЕЙ, Ала МАРДВІЛКА, Людміла БАДАМШЫНА, Вераніка СІЛЮЦІНА.

ДАВЕДКА «ЗВЯЗДЫ»

Указам Прэзідэнта № 318 ад 12 ліпеня 2005 года рэалізацыя маёмасці, якая вызваляецца ва Узброеных Сілах, іншых войсках, воінскіх фарміраваннях і ваенізаваных арганізацыях Рэспублікі Беларусь, была даручана РУП «Белспецкантракт». Указ набыў сілу з 1 лістапада 2005 года. Прадпрыемства ўваходзіць у склад дзяржаўнага аб'яднання «Белрэсурсы», знаходзіцца ў непасрэдным падпарадкаванні ДА «Белрэсурсы» і Міністэрства гандлю. З 27 сакавіка 2006 года РУП «Белспецкантракт» узначаліў Алік Айзатулін.

Сёння РУП «Белспецкантракт» у сваёй дзейнасці кіруецца Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь № 626 ад 18 лістапада 2008 года «Аб удасканаленні парадку распараджэння матэрыяльнымі рэсурсамі, якія вызваляюцца, Узброеных Сіл, іншых войскаў, воінскіх фарміраванняў і ваенізаваных арганізацый Рэспублікі Беларусь», у адпаведнасці з якім прадпрыемства і з'яўляецца ўпаўнаважанай арганізацыяй па рэалізацыі на платнай аснове такой маёмасці. У прыватнасці, РУП «Белспецкантракт» рэалізуе:

— аўтамабільную тэхніку (МАЗ, КрАЗ, ГАЗ, ЗІЛ, Урал, УАЗ, КАМАЗ, рамкамплекты і запчасткі да іх, прычэпы і паўпрычэпы, электракары і інш.);

— спецтэхніку (паліваззапраўшчыкі, аўтацыстэрны, маслазапраўшчыкі, уніфікаваныя кампрэсарныя станцыі, кузавы-фургоны, кунгі, прычэпы-цыстэрны, пагрузчыкі і самапагрузчыкі, рамонтныя майстэрні і станкі, электрастанцыі, электраагрэгаты, самалёты, верталёты, авіярухавікі, тэхніка аэрадромнага забеспячэння і інш.);

— іншую тэхніку і маёмасць харчовага, рэчавага, хімічнага, медыцынскага, інжынернага, аўтамабільнага, ідэалагічнага працы, сувязі, РАУ і бранятанкавага ўпраўленняў.

Намеснік дырэктара Вольга КОР'ЕВА.

НАШЫ КААРДЫНАТЫ:
220099, Мінск, вул. Казінца, 2, пакой 602 (аддзел рэалізацыі)
Тэлефон. +375 17 2780967, тэлефон/факс +375 17 2242001
Час працы з пакупнікамі: з 9:00 да 17:00. Абед — з 13:00 да 14 00
Адрас у інтэрнэце:
http://www.belspeckontrakt.by УНП 101099370

Ухіл у камерцыйнай дзейнасці сёлета будзе на цэмент

Намеснік дырэктара па камерцыйнай дзейнасці Уладзімір УРБАНОВІЧ.

Два гады таму РУП «Белспецкантракт», акрамя асноўнага напрамку па рэалізацыі вайсковай маёмасці, якая вызваляецца ў сілавых структурах Рэспублікі Беларусі, стала займацца яшчэ і камерцыйнай дзейнасцю. У прыватнасці, сёння РУП «Белспецкантракт» з'яўляецца асноўным пастаўшчыком металавырабаў, а ў канцы 2011 года былі заключаны дамовы з двума цэментнымі заводамі:

— У асноўным камерцыйная дзейнасць ў 2011 годзе вялася па кантракце з Беларускім металургічным заводам: яны нам прадавалі арматуру рознага дыяметру, а мы ўжо гэтай прадукцыяй, як асноўныя пастаўшчыкі, забяспечвалі ўсе будаўнічыя арганізацыі. У тым ліку прадавалі арматуру і праз беларускую біржу, — расказвае дырэктар Алік АЙЗАТУЛІН. — Сёння мы думаем пра тое, як пашырыць камерцыйную дзейнасць. Зараз ужо заключаны два кантракты з Крычаўскім і Калінкавіцкім цэментнымі заводамі на пастаўку цэменту ў аб'ёме 7,5 тысячы тон для забеспячэння патрэбы як індывідуальных будаўнікоў, так і будаўнічых арганізацый. Бо ў пэўныя перыяды года бываюць цяжкасці з цэментам, і мы хочам, каб гэтыя цяжкасці неяк трошкі аслаблі.

Як патлумачыў **намеснік дырэктара Уладзімір УРБАНОВІЧ**, асноўная прычына, чаму арганізацыям выгадна закупляць прадукцыю ў РУП «Белспецкантракт» — гэта магчымасць працаваць з адтэрміноўкай плацяжу:

— Беларускія прадпрыемствы на 95% хочуць спажываць прадукцыю з адтэрміноўкай плацяжу, але вытворцы працуюць толькі па перадаплаце. Таму існуе інстытут асноўных пастаўшчыкоў, і мы, арыентуючыся на заяўкі, стараемся задаволіць патрэбы нашых дробных спажыўцоў.

Таксама, як лічыць Уладзімір Іосіфавіч, партнёры болей давяраюць дзяржаўнай арганізацыі:

— Дзяржарганізацыі аддаюць перавагу ў працы таксама дзяржарганізацыям. Прыватнікі — глядзяць, у каго танней. Хаця ёсць некаторыя будаўнічыя арганізацыі прыватнай формы ўласнасці, якія таксама хочуць купляць у дзяржаўнай арганізацыі. Да таго ж вялікае значэнне мае цана — паколькі мы дзяржарганізацыя, мы закладваем толькі такі працэнт, каб пакрыць нашу зарплату і іншыя выдаткі. Хоць, у прынцыпе, цану можна было б і падняць, але мы не можам — каб мінімізаваць далейшыя цэны і такім чынам не раскручваць інфляцыю ў краіне.

Уладзімір Урбановіч паведаміў, што сёння РУП «Белспецкантракт» працуе рэнтабельна і збіраецца і далей развіваць і асноўную, і камерцыйную дзейнасці:

— Наша задача — зарабляць грошы. І мы прыходзім на працу не для таго, каб атрымліваць грошы, а каб іх спачатку зарабляць, а потым ужо атрымліваць. Таму мы гатовы займацца любым відам дзейнасці, які будзе рэнтабельны і ад якога можна атрымаць прыбытак.

Напрыклад, як падзяліўся планамі з карэспандэнтам «Звязды» Алік Айзатулін, ёсць задума наладзіць выпуск будаўнічых сетак з арматуры, з дапамогай якіх адліваюць слупы. Такая прадукцыя, безумоўна, будзе карыстацца попытам у будаўнічых арганізацый, але сёння пакуль ёсць праблема — у прадпрыемства не хапае складскіх і вытворчых памяшканняў. Але, як лічыць Алік Фацехавіч, калі Міністэрства гандлю пасадзейнічае і дапаможа гэтае пытанне вырашыць, то такая вытворчасць у хуткім часе з'явіцца.

Вядучы спецыяліст упраўлення рэалізацыі Паліна ГРУДЗІНА і спецыяліст гэтага ж падраздзялення Наталля ПАГІРНІЦКАЯ.

Купіць можна ўсё — ад пальчатак і адзення да верталётаў!

Уся маёмасць, рэалізацыяй якой займаецца РУП «Белспецкантракт», не знаходзіцца недзе на адным складзе ў Мінску — яна захоўваецца ў воінскіх часцях і іншых вайсковых фарміраваннях. Але, як патлумачыла **Вольга КОР'ЕВА, намеснік дырэктара**, працэдура пакупкі не складаная, у тым ліку існуе магчымасць азнаёміцца з таварам перад аплатай:

— Уся маёмасць знаходзіцца ў вайсковых часцях, а не ў нас — нам яна перадаецца толькі дакументальна па дамове камісіі. Наш планава-разліковы сектар разлічвае кошт маёмасці, ён зацвярджаецца на камісіі і дырэктарам, пасля чаго інфармацыя паступае ў аддзел рэалізацыі і на сайт прадпрыемства. Калі вас там нешта зацікавіла, то вы звяртаецеся ў аддзел рэалізацыі, падпісваеце дагавор, аплачваеце тавар у банку і потым едзеце па маёмасць у тую ці іншую вайсковую часць. Калі ёсць патрэба — можна спачатку з'ездзіць паглядзець, у якім стане знаходзіцца патрэбны вам тавар. Больш за тое, мы нават настойліва рэкамендуем паглядзець, асабліва калі пакупка сур'ёзная. Бо тавар усё-такі быў у карыстанні, таму трэба ўважліва ўсё ацаніць перад пакупкай.

Па словах Вольгі Аляксееўны, у РУП «Белспецкантракт» звяртаюцца розныя катэгорыі пакупнікоў — і простыя грамадзяне, і прадпрымальнікі, і юрыдычныя асобы розных формаў уласнасці. Напрыклад, будаўнічыя арганізацыі купляюць тэхніку і аэрадромныя пліты, сельскагаспадарчыя арганізацыі — тэхніку і запчасткі, бо прыдбаць новую яны не ў стане, а былую ў карыстанні — могуць. Тым больш што ў калгасаў, як правіла, ёсць рамонтныя майстэрні, і яны могуць яе падрамантаваць. Таксама сельскагаспадарчыя арганізацыі купляюць і паходныя кухні, відаць для таго, каб арганізоўваць гарачае харчаванне для работнікаў у палявых умовах. Індывідуальныя прадпрымальнікі набываюць вельмі шырокі спектр тавараў — машыны, заправачныя і разлівачныя станцыі, адзенне, пальчаткі і г. д. Што тычыцца простых грамадзян, то яны бяруць адзенне, біклагі, посуд, міліцэйскія жэзлы. Апошнія — відаць, у падарунак знаёмым у якасці сувеніру.

— Пэўны час добрым попытам карыстаўся спецыяльны армейскі пральны парашок — як казалі, ён быў лепей за замежныя мыйныя сродкі. Што яшчэ купляюць? Напрыклад, кінастудыя «Беларусьфільм» часта купляе старое вайсковае адзенне. Яго ж купляюць і старавяры, бо яно з простых тканін, — расказвае Вольга Кор'ева.

Мы пацікавіліся ў дырэктара РУП «Белспецкантракт», што самае арыгінальнае за ўвесь час яго працы было рэалізавана з дапамогай прадпрыемства:

— Самы цікавы продаж, на мой погляд, гэта верталёт МІ-26, які мы рэалізавалі праз аўкцыён у 2011 годзе. Кошт быў значны — пачатковая цана склала 3,7 мільярда рублёў. Паколькі гэта маёмасць каштуе звыш 10 тысяч базавых велічынь, то трэба было распараджэнне Прэзідэнта — яго мы атрымалі і выставілі верталёт на аўкцыён. Знайшліся пакупнікі — цана продажу склала 4,5 мільярда. Гэта быў важкі ўнёсак у выкананне плана рэалізацыі і ў паступленне грашовых сродкаў у бюджэт, — расказаў Алік Айзатулін і дадаў, што верталёт, дарэчы, купіла беларуская арганізацыя.

ФІЛІЯЛЫ:

✓ у Асіповічах: вул. Касмічная, д. 50, пакой 117, тэл./факс. 8(02235) 70541, маб. (029) 7762499 (МТС);

✓ у в. Краснае: Мінская вобласць, Маладзечанскі раён, вёска Краснае, вул. 1 мая, будынак № К1-202, пакой. 2, тэл./факс. 8(0176) 796835, маб. (029) 5045978 (МТС).

З ЧЫМ БЛІНЦЫ СМАЧНЕЙШЫЯ?

ВАРЫЯНТ ДРУГІ. Смачны, але не для фота

Вам спатрэбіцца:
150 гр. сала з праслойкамі мяса
150 гр. свініны
2 цыбуліны
3 яйкі
300 гр. смятаны
Соль і спецыі

Вырашыўшы прыгатаваць гэтую мачанку, я не думала, што пераканаюся, наколькі нешта неапетытнае на выгляд часта бывае надта смачным.

Сала з мясам неабходна нарэзаць і падсмажыць, туды ж дадаць нарэзаную цыбулю, соль і прыправы. Так я і зрабіла. Трэба сказаць, да гэтага моманту ўсё выглядала досыць апетытна і прыстойна. Далей, згодна з рэцэптам, прыйшла чарга смятаны, перамешанай з яйкамі. Маса ў патэльні пры гэтым павінна працягваць булькатаць і смажыцца. Як толькі дадала смятану, выгляд стравы адразу неяк сапсаваўся. Мяса стала нейкім страшэнна-шэранькім, а сырыя яйкі, як старанна я ні перамешвала мачанку, пачалі смажыцца камячкамі. Пахла страва нішто сабе, таму пакаштаваць усё ж адважылася. Аказалася, цудоўна. Смятана і яйкі, што, як здалося, сапсавалі страву, зрабілі яе смак вельмі далікатным. І ўсё ж фатаграфаваць атрыманую смакату я не адважылася.

ВАРЫЯНТ ТРЭЦІ. Тварожна-далікатны

Вам спатрэбіцца:
200 гр. тварагу
100 гр. сыраквашы
Соль і перац альбо цукар

Рэцэпт вычытаны ў кнізе Алеся Белага «Наша страва. Сапраўдная беларуская кухня». Паходзіць з Гродзенскага павета.

Каб прыгатаваць тварожную мачанку, тварог пераціраецца са смятанай і сыраквашай з дапамогай відэльца (больш сучасны варыянт — узбіць у куханным камбайне). Соль з перцам альбо цукар — на ваш смак. Для сваёй стравы я выбрала першы варыянт. Рэцэпт вельмі просты і хуткі. І смачны, у чым магу запэўніць.

ВАРЫЯНТ ЧАЦВЁРТЫ. Салодка-мадэрновы

Вам спатрэбіцца:
100 гр. насення маку
100 гр. цукру
50 гр. смятаны
Загушчальнік (калі ёсць)

— А чаму б табе не паспрабаваць зрабіць салодкую мачанку? — спытала адна знаёмая, даведаўшыся пра мой кулінарны эксперымент. Салодкіх аўтэнтычных беларускіх рэцэптаў знайсці, на жаль, не ўдалося. Таму давялося займацца варыяцыямі на тэму. Узгадала пра салодкі мак, які мая бабуля рабіла для пірагоў. Папярэдне ён замочваўся ў цёплай вадзе на некалькі гадзін, пасля чаго туды дадаваўся цукар і маса ўзбівалася. Я вырашыла ўзбіць смятану з цукрам і загушчальнікам, пасля чаго дадаць туды мак, прыгатаваны вышэйапісаным чынам. Атрымаўся вельмі лёгкі і смачны крэм. Такая своеасаблівая макавая мачанка.

ВАРЫЯНТ ПЯТЫ. Грыбны. Пікантны

Вам спатрэбіцца:
200 гр. свежых грыбоў
2-3 сушаныя грыбы
1 ст. лыжка мукі
50 гр. смятаны
50 гр. сметанковага масла
Соль

Разжыцца свежымі грыбамі напрыканцы зімы, зразумела, праблематычна, таму ў ход пайшлі замарожаныя маслячкі з восеньскіх запасаў. Грыбы абсмажваюцца на алеі і сметанковым масле, сушаныя крышацца на маленькія кавалачкі і таксама дадаюцца ў патэльню. Пад канец пасаліць і дадаць смятану. Патушыць з паўгадзінкі. Мачанка атрымліваецца вельмі цікавай на смак: сушаныя грыбы дадаюць своеасаблівую далікатную нотку, а смятана з маслам, перамяшаўшыся з грыбным сокам, ператвараюцца ў найсмачнейшую поліўку, якую варта пакаштаваць.

Ганна ГАРУСТОВІЧ.

Заканчэнне.
Пачатак на 1-й стар.

«ЛЕВЫ» СПІРТ

У Гродне затрымана буйнейшая ў гэтым годзе ў рэспубліцы партыя нелегальнага спірту, якая ацэньваецца прыкладна ў 800 мільёнаў рублёў.

У адным з гаражных кааператываў затрымалі непрацуючага жыхара абласнога цэнтра, які разгружаў з мікрааўтобуса «Фальксваген» пяцілітровыя каністры са спіртам. У салоне было каля 2 тон. А потым аператыўнікі заняліся фурай на аўтастаянцы — там аказалася яшчэ 8 тон аналагічнага грузу. Спірт пад выглядам «Антыабледзяняльніка» прыбыў у Гродна з Расіі і быў, верагодна, прызначаны для рэалізацыі праз дробнаптовых прадаўцоў.

Барыс ПРАКОПЧЫК.

Усміхнемся

У Алеся Мухіна ў метро скралі тэлефон. 1:0 на карысць тэлегледачоў.

iPhone, які зваліўся ва ўнітаз, падаўжае руку, прынамсі, сантыметраў на дваццаць.

— Доктар! Што са мной?
— А колькі ў вас з сабой грошай?

У вас праблемы з самаацэнкай? Вы любіце самасцвярджацца, зневажаючы і абражаючы іншых людзей? Вы ненавідзіце людзей у прынцыпе? Праца ў дэканаце чакае вас!

Лепшы сродак ад зладзеяў — паперка ў дзвярах: «Дарагі, усе змеі зноў распаўзліся. Збяры іх, я не паспела!».

Дзве даты

23 лютага

1275 год — нарадзіўся Гедымін, вялікі князь літоўскі. Пачатак праўлення Гедыміна адзначылася стварэннем у ВКЛ самастойнай Літоўскай праваслаўнай мітраполіі і спробай нармалізаваць адносіны з каталіцкім Захадам.



У 1323 годзе ў шэрагу паслanняў, называючы сябе «каралём Літвы і Русі, уладаром і князем Жмудзі», выказваў намер прыняць каталіцкае хрышчэнне, запрашаў у ВКЛ манахаў і майстроў розных спецыяльнасцяў, гарантаваў ім ільготы. Заключыў дагавор з 1323 года з Лівоніяй. Ад хрышчэння адмовіўся, задаволіўшыся ў 1324-м мірам з Тэўтонскім ордэнам. Пры ім пад уладу ВКЛ перайшлі Берасцейшчына і Падляшша. Васалам Гедыміна быў менскі князь Васіль. У Полацку княжыў брат Гедыміна Воінь. Пад непасрэдную ўладу Гедыміна таксама адышлі Тарапецкае і Ржэўскае княствы. Гедымін вёў напружаную барацьбу супраць Тэўтонскага і Лівонскага ордэнаў. За час яго праўлення ВКЛ ператварылася ў моцную ўсходне-еўрапейскую дзяржаву, тэрыторыя якой павялічылася ўдвая. Памёр у 1341 годзе, забіты пры аблозе адной з крэпасцяў крыжакоў стрэлам з агнястрэльнай зброі, якая толькі-толькі ўваходзіла ва ўжыванне. Пасля яго засталося 7 сыноў, якія падзялілі яго ўладанні на ўдзелы.

1878 год — нарадзіўся Казімір Севярынавіч Малевіч, вядомы беларускі і расійскі мастак. Адзін з заснавальнікаў абстрактнага мастацтва, заснавальнік супрэматызму. У 1904-05 гадах быў вольным слухачом Маскоўскага вучылішча жывапісу, скульптуры і дойлідства, удзельнічаў у выставах «Бубновы валет». У 1918 годзе выкладаў у Дзяржаўных вольных мастацкіх майстэрнях у Маскве і Петраградзе, затым — у Народнай мастацкай школе «новага рэвалюцыйнага ўзору» ў Віцебску. У 1923-27 гадах — дырэктар Ленінградскага інстытута мастацкай культуры. Аўтар знакамітага «Чорнага квадрата». Сярод карцін — «Жанчына з кветкай», «Квітнеюць яблыні» і іншыя. Стваральнік таварыства «Сцвярджальнікі новага мастацтва» («Уновис»). У 1920-х гадах кіраваў мастацкім афармленнем гадавін Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Віцебску. Аўтар кніг «Ад кубізму і футурызму да супрэматызму», «Супрэматызм» і іншых. Памёр у 1935 годзе.

Цытата дня

«Кожны народ не без роду і племя і мае летапіс свой і гісторыі след на старонках».

Мікола Гусоўскі (1470—1533), беларускі паэт-гуманіст і асветнік эпохі Адраджэння.

ШЫШКА — ПРАДУКТ СТРАТЭГІЧНЫ!

Лясгасы краіны завяршаюць нарыхтоўку лесанасеннай сыравіны. За сёлетні сезон збору шышак хваёвых пародаў дрэў, які распачаўся ў канцы лістапада мінулага года, яны нарыхтавалі ўжо 519 тон шышак елкі і 374 тоны — сасны, паведамілі ў Міністэрства лясной гаспадаркі.

У Рэспубліканскім лясным селекцыйна-насенняводчым цэнтры і лесанасенных цэхах лясгасаў вядзецца актыўная перапрацоўка сабранай сыравіны. У першую чаргу перапрацоўваюцца шышкі елкі, якая пладаносіць з перыядычнасцю адзін раз на пяць гадоў. Сабраны падчас сёлетняга сезона ўраджай шышак елкі дазволіць сфарміраваць запас насення для лесааднаўлення і лесаразвядзення да наступнага пладанашэння гэтай пароды.

У выніку перапрацоўкі ўжо атрымана амаль 3,7 тоны якаснага насення еўрапейскай елкі, якое папоўніць стратэгічны запас насення. У халадзільных камерах селекцыйна-насенняводчых вытворчасцяў Мінлясгаса зараз захоўваецца 13,4 тоны насення.

Сяргей РАСОЛЬКА.

Уважаемые акционеры ОАО «ЛИДСЕЛЬМАШ»

30 марта 2012 года СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ ОАО «Лидсельмаш», расположенного по адресу: г. Лида, ул. Советская, 70 (конференц-зал)

ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:

1. Отчет генерального директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год. Утверждение показателей прогноза социально-экономического развития Общества на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2011 году.
3. О результатах аудита и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 год, распределение прибыли и убытков Общества.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. Об утверждении распределения и использования прибыли и убытков, выплате дивидендов за 2011 год.
6. Утверждение направлений распределения прибыли на 2012 год.
7. Об увеличении уставного фонда Общества путем дополнительного выпуска акций, утверждения решения о выпуске акций Общества, о передаче акций дополнительного выпуска в собственность Республики Беларусь.
8. Об утверждении изменений в Устав Общества.
9. Об избрании членов наблюдательного совета, его составе и ревизионной комиссии Общества.
10. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Начало работы собрания **в 16.00.**
Регистрация участников собрания **с 15.00 до 15.50.**

УНП 500021638 *Наблюдательный совет ОАО «Лидсельмаш».*

СЁННЯ

Месяц
Маладзік 22 лютага.
Месяц у сузор'і Рыбаў.

Сонца

	Усход	Захад	Даўжыня дня
Мінск —	8.13	18.33	10.20
Віцебск —	8.05	18.20	10.15
Магілёў —	8.03	18.23	10.20
Гомель —	7.57	18.23	10.26
Гродна —	8.28	18.49	10.21
Брэст —	8.25	18.52	10.27

Імяніны
Пр. *Валянціны, Ганны, Паўлы, Парфірыя, Прохара.*
К. *Ізабелы, Дзям'яна, Палікарпа, Рамана, Севярына.*

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

НАДВОР'Е на заўтра



ИЗВЕЩЕНИЕ О ПРОВЕДЕНИИ 28 марта 2012 г. ОТКРЫТОГО КОНКУРСА НА ПРАВО РАЗМЕЩЕНИЯ СРЕДСТВ НАРУЖНОЙ РЕКЛАМЫ вдоль ул. Лейтенанта Кижеватова в г. Минске

Минский городской центр недвижимости

УП «Минский городской центр недвижимости» (Организатор конкурса) проводит открытый конкурс на право размещения средств наружной рекламы вдоль ул. Лейтенанта Кижеватова в г. Минске.

№ предмета конкурса	Ориентировочное место размещения средства наружной рекламы правая сторона*	Место согласно схеме*	Площадь рекламного поля	Количество рекламных полей	Начальная цена, рублей
1.	пересечение ул. Аэродромной-Брилевской	А-4	3х6	2	987 840
2.	вдоль ж/д ул. Брилевской	А-7	3х6	2	987 840
3.	вдоль ж/д ул. Брилевской	А-8	3х6	2	987 840
4.	Брилевский тупик	А-9	3х6	2	987 840
5.	напротив здания № 2 по ул. Казинца	Б-1	3х6	2	987 840
6.	напротив жилого дома № 20 по ул. Лейтенанта Кижеватова	Б-4	3х6	2	987 840
7.	напротив жилого дома № 66 по ул. Лейтенанта Кижеватова	Г-1	3х6	2	987 840
8.	напротив жилого дома № 72/1 по ул. Лейтенанта Кижеватова	Г-4	3х6	2	987 840
9.	напротив здания по ул. Серова, 1	Г-5	3х6	2	987 840
10.	напротив жилого дома № 78 по ул. Лейтенанта Кижеватова	Г-6	3х6	2	987 840
11.	напротив жилого дома № 86 по ул. Лейтенанта Кижеватова	Г-9	3х6	2	987 840
12.	в системе транспортной развязки ул. Лейтенанта Кижеватова и МКАД со стороны слуцкого направления	Г-12	3х6	1	493 920
13.	в системе транспортной развязки ул. Лейтенанта Кижеватова и МКАД со стороны слуцкого направления	Г-13	3х6	1	493 920

**Со схемой расположения мест размещения средств наружной рекламы можно ознакомиться у организатора конкурса.*

Рекламные конструкции, право установки которых выставлено на торги, должны соответствовать следующим требованиям:

– фундаментный блок рекламной конструкции должен быть заглублен в землю;

– рекламная конструкция должна быть двухсторонней (кроме предметов конкурса №12 и №13) с рекламными полями размером 3х6 м;

– освещение рекламной конструкции должно быть осуществлено с применением светодиодных линеек;

– средства наружной рекламы должны соответствовать требованиям СТБ 1581-2008 «Средства наружной рекламы. Общие технические требования и определения»;

– проект привязки рекламной конструкции разрабатывается и согласовывается рекламораспространителем в установленном порядке (масштаб 1:500, 5000);

– окончательный внешний вид рекламной конструкции подлежит согласованию с комитетом архитектуры и градостроительства Мингорисполкома.

Условие проведения торгов – наивысшая цена, предлагаемая за право размещения средств наружной рекламы в указанных в настоящем извещении местах, которая должна быть выше начальной цены.

Организатор конкурса – УП «Минский городской центр недвижимости», г. Минск, ул. К. Маркса, 39.

Конкурс состоится 28 марта 2012 г. в 11.00 по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 7.

Документы на участие принимаются **с 24 февраля по 26 марта 2012 г.** в рабочее время (перерыв на обед с 13.00 до 14.00) по адресу: г. Минск, ул. К. Маркса, 39, каб. 6. Документы, поданные после указанного времени, не рассматриваются.

Задаток в размере 10 процентов от начальной цены предмета торгов должен быть внесен до 17.00 26.03.2012 на расчетный счет организатора конкурса № 3012104971019, в региональной дирекции № 700 ОАО «БПС-Сбербанк», г. Минск, пр-т Машерова, 80, код 153001369, УНП 190398583, УП «Минский городской центр недвижимости».

Конкурс проводится в порядке, предусмотренном Инструкцией о порядке проведения торгов (конкурса) на право размещения средства наружной рекламы (наружной рекламы) на объекте коммунальной собственности города Минска, утвержденной решением Мингорисполкома от 1 апреля 2010 г. № 720.

Для участия в конкурсе в срок, установленный для приема документов на участие в конкурсе, организатору представляются следующие документы:

заявление на участие в конкурсе установленной формы;

документ, подтверждающий внесение платы за оформление паспорта средства наружной рекламы в размере 537 814 рублей, в т.ч. НДС (плата за оформление паспорта средства наружной рекламы вносится на расчетный счет УП «Минскреклама» № 3012000423813 в отделении 538 ОАО «Белинвестбанк», БИК 153001739, УНП 100302749);

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет организатора;

макет наружной рекламы в трех экземплярах на бумажном носителе в формате А4, выполненный в цвете;

эскиз средства наружной рекламы в увязке с конкретной архитектурно-планировочной ситуацией по месту его размещения, выполненный на бумажном носителе в цвете;

три фотографии места размещения средства наружной рекламы размером 9х13 сантиметров (1 фотография с панорамной съемкой места размещения средства наружной рекламы, 2 фотографии с обозначением места размещения средства наружной рекламы), выполненные в цвете.

Лицо, подающее документы на участие в конкурсе, предъявляет документ, удостоверяющий личность.

Предложения по выполнению условия конкурса представляются в письменной форме, подписываются участником, скрепляются печатью и представляются в запечатанном конверте одновременно с вышеназванными документами. Предложения участников, представленные на конкурс, являются окончательными и уточняться в ходе конкурса не могут.

Оплата за право размещения средств наружной рекламы осуществляется победителем конкурса разовым платежом в течение 5 рабочих дней со дня проведения торгов.

Победитель конкурса в течение 5 рабочих дней со дня проведения конкурса обязан возместить УП «Минский городской центр недвижимости» затраты на организацию и проведение конкурса, в том числе расходы, связанные с изготовлением и предоставлением участникам документации, необходимой для его проведения. Информация о затратах, порядке и сроках их возмещения доводится до сведения участников перед началом торгов под роспись.

Договор на размещение (распространение) наружной рекламы между победителем конкурса и финансовым управлением Мингорисполкома заключается в течение 5 рабочих дней со дня последнего согласования (возврата победителем конкурса согласованного паспорта средства наружной рекламы) либо представления согласованной и утвержденной проектной документации, при условии внесения оплаты за предмет торгов и возмещения организатору конкурса расходов на организацию и проведение конкурса.

Срок, на который заключается договор на размещение (распространение) наружной рекламы, составляет 5 лет.

Телефон для справок (017) 227 40 22.

Интернет www.mgcn.by

К сведению акционеров ОАО «Витебские ковры».
ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ

ОАО «ВИТЕБСКИЕ КОВРЫ»

СОСТОИТСЯ 28 марта 2012 г. в 14.00
по адресу: г. Витебск, ул. М. Горького, 75.

Регистрация акционеров в день проведения собрания **с 12.30 до 13.50** (иметь документ, удостоверяющий личность). Список акционеров для регистрации участников собрания составлен по данным реестра акционеров **на 12 марта 2012 г.**

ПОВЕСТКА ДНЯ:

1. Отчет об итогах работы Общества за 2011 год и задачах по обеспечению выполнения показателей прогноза социально-экономического развития на 2012 год.
2. Отчет наблюдательного совета о работе в 2011 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2011 г.
4. Утверждение годового баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2011 год.
5. О распределении чистой прибыли, полученной в 2011 году, и направлениях ее использования в 2012 году.
6. О выплате дивидендов за 2011 год.
